АЛЯКСАНДР ВАШЧАНКА

# ROCK FOREVER



АЛЯКСАНДР ВАШЧАНКА

# ROCK FOREVER

## АЛЬБО ЧАТЫРЫ ПАДАРОЖЖЫ Ў МІНУЛАЕ

Аповесць

Мінск
«Белпринт»
2023

УДК 394.014
ББК 77.55
В23

Аляксандр Вашчанка

**Вашчанка, А. П.**

В23 Rock forever, альбо Чатыры падарожжы ў мінулае / Аляксандр Вашчанка. – Мінск : Белпринт, 2023. – 104 с.

ISBN 978-985-459-625-9.

Рашэнне галоўнага дзеючага героя аповесці Зміцера сабраць праз дваццаць год былых удзельнікаў студэнцкага рок-гурта для выступлення на юбілеі ўніверсітэта ператвараецца ў поўнае прыгод падарожжа ў мінулае. Сутычкі з бандытамі, магія і замовы, каханне і здрада, рыбалка на ... іхціязаўра, сапраўднае мужчынскае сяброўства і, безумоўна, стары добры рок – усё гэта арганічна ўпісваецца ў імклівае і захапляючае развіццё сюжэту, якое не пакіне абыякавым ніводнага чытача аповесці «Rock forever». Аповесць атрымала станоўчыя чытацкія водгукі пасля друкавання ў часопісе «Маладосць».

**УДК 394.014**
**ББК 77.55**

**ISBN 978-985-459-625-9**

© Вашчанка А. П., 2023
© Афармленне. ТАА «Белпринт», 2023

*Сыну Аляксандру прысвячаю*



Кроплі халоднага восеньскага дажджу павольна паўзлі па шыбе. Я стаяў ля акна і назіраў за гэтым сумным відовішчам. Цікава, якая з дзвюх суседніх кропель першай дапаўзе да фінішу: вунь тая тоўстая, падобная на слімака, ці меншая, са срэбным адценнем? І хаця я хварэў за срэбную, слімак перамог. Вось так і ў жыцці: перамагаюць тоўстыя і важкія...

— Над чым задумаўся, Зміцер? — да маёй спіны прytуліліся пругкія грудзі сакратаркі Тамары. Былі моманты, калі падобнага дотыку было дастаткова для таго, каб схапіць гэта прыгожае і падатлівае жаночае цела і авалодаць ім прама на быццам бы спецыяльна створаным для гэтай мэты эратычнымі немцамі шырокім падаконніку шклопакета. Потым адключыць усе тэлефоны і перайсці на скураную канапу. Пасля разам паехаць у саўну, закаціць у рэстаран, цалавацца пад «Yesterday» і рэзаць твіст пад «Чорнага ката». Забурыцца ў маю халасцяцкую аднапакаёўку і палохаць суседзяў нястрымнымі стогнамі ўзаемнай жарсці. Але зараз мне не хацелася. Нічога. І ў думках, і ў справах жыў крызіс. Маё маленькае паліграфічнае прадпрыемства ледзьве зводзіла канцы з канцамі. Сур'ёзныя заказы на друкаванне падручнікаў і шматтыражных жаночых раманаў перахоплівалі салідныя фірмы з сувязямі ў вярхах, а мы перабіваліся выпускамі календароў і танных кніжак кшталту «Як зарабіць мільён». У беларускіх рублях.

— Нічога, даражэнькі, хутка зіма. Надрукуем прыгожых календароў, наладзяцца справы, — падбадзёрыла мяне Тома. — Ты не забыўся: сёння ж канцэрт «Скорпаў»?!

Вядома, я не забыўся. «Scorpions» — гэта сапраўдны рок, гэта мая маладосць! Білеты, хоць і каштавалі нятанна, былі куплены за два месяцы, бо гурты такога ўзроўню прыязджаюць у Мінск даволі рэдка. Я не дараваў бы сабе, калі б прапусціў канцэрт. Ад думак пра прыемны вечар настрой у мяне ўзняўся, я павярнуў Тамару да сябе і пацалаваў у пахучыя ад кавы вусны. Перавёў пагляд ніжэй — два пругкія мячыкі апетытна выглядалі з-пад кофтачкі. Ну, жанчыны! Ну, д'ябаліцы! Грудзі не больш другога памеру, а падбяруць такі бюсцік, так сціснуць і ўзнімуць свае райскія грушы, што здаецца — перад табой Памэла Андэрсэн. І кідаемся мы, слабыя мужыкі, на прынаду Евы, быццам дурны акунь на чарвяка, і чапляюць нас на кручок разумніцы жанчыны, і робяць з намі што заўгодна. Суцяшае адно: пакуль мы, нават ведаючы, што праблем будзе ў сто разоў болей, чым задавальнення, будзем імкнуцца да жанчыны, да тае пары будзем заставацца мужчынамі.

Я ўжо пачаў расшпільваць верхні гузік Томінай кофтачкі, калі яна сказала:

— Пачакай, Зміцер, там табе нейкі дзіўны факс прыйшоў. Не хочаш паглядзець?

— Я лепш на твае грудзі пагляджу, спакусніца, — прашаптаў я.

— Яшчэ наглядзішся. Пайшлі ў прыёмную.

Прыйшлося паслухацца. Ля факса ляжаў ліст паперы з адным сказам: «Гурт "Мішка касалапы" запрашаецца да ўдзелу ва ўрачыстым канцэрце, прысвечаным юбілею ўніверсітэта».

— Ты што-небудзь разумееш? — запыталася Тамара.

— Крыху...

— А што гэта за «Мішка касалапы»?

— Наш студэнцкі вакальна-інструментальны ансамбль. Я, дарэчы, іграў на сола-гітары!

— Ах ты мой Джордж Харысан! — засмяялася Тома. — Якіх толькі талентаў у цябе няма!

— Вядома, але не ўсе гэта разумеюць...

— Ад сціпласці ты не памрэш.

— Каб за талент яшчэ плацілі грошы... Добра, Томачка, я зараз прабягуся па выдавецтвах і а палове шостай заеду за табой. Помні — на канцэрце ты павінна быць самай прыгожай!

— Не баішся, што скрадуць?

— Хай толькі паспрабуюць — маргалы выкалю!

Мне хапіла дзвюх гадзін, каб праехацца па выдавецтвах і нават у адным з іх атрымаць нядрэнны заказ. Вядома, пад пэўны працэнт «адкату». Потым я заскочыў у «Макдональдс» і перакусіў чызбургерам з вялікай порцыяй бульбы-фры. Запіваючы гэту шкодную, але смачную ежу кавай, падумаў: «Амерыканцам не адмовіш у тым, што справу хуткага харчавання яны распрацавалі да дробязей. Вось мы — бульбашы, а такой доўгай і смачнай бульбы, якую падаюць у гэтых рэстаранах, яшчэ не ўмеем вырошчваць. Я аднойчы хацеў на кухні «Макдональдса» купіць некалькі клубняў, каб завесці матулі ў вёску, дык аказалася, што пачышчаную і замарожаную яе прывозяць прама з Польшчы, а ў нас яшчэ толькі робяцца спробы развесці падобныя гатункі. А вось каву яны варыць не ўмеюць. Не гурманы».

Я забег дамоў, пагаліўся, прыняў душ і ў меднай турцы на пяску зварыў сабе кубачак сапраўднай кавы, якую мне сябры рэгулярна прывозяць з Германіі. Па звычцы палез у кішэню па цыгарэты, але ўспомніў, што ўжо другі тыдзень як не палю. Ад шкодных звычак трэба час ад часу адмаўляцца, калі паважаеш сябе любімага. Потым апрануў блакітны джынсавы касцюм фірмы «Levi's», каўбойскія боцікі, такі ж брыль, пшыкнуўся арыфлэймаўскім «Soul» і паехаў да Тамары. Па дарозе купіў белую ружу і каробку цукерак «П'яная вішня». Праз пяць мінут я ўжо званіў у дзверы кватэры, якую Тамара здымала разам з сяброўкай.

— Заходзь, каўбой, — сказала яна, цмокнуўшы мяне ў шчаку. — Дзякуй за ружу. І цукеркі такія смачныя! І водар ад

цябе прыемны! Пачакай крышку, мне засталося некалькі штрыхоў.

Яна зноў з'явілася ў пакоі праз хвіліну.

— Як я табе?

На мяне глядзела шыкоўная дваццаціпяцігадовая бландзінка. Блакітныя джынсы прыгожа абцягвалі стройныя бёдры і пругкія ягадзіцы. Чорны з белым узорам світэр падкрэсліваў прыгажосць грудзей і дадаваў эратызму і ў без таго сексуальнае аблічча. Што-што, а густ у Томы быў: яна ведала, што джынсы на рок-канцэрт — гэта тое ж, што вячэрняя сукенка ў філармонію.

— Няма слоў, мая рокерша. У такім выглядзе ты б спакусіла ўсіх паслушнікаў Жыровіцкага манастыра, а ў сярэднявеччы цябе б абавязкова спалілі на вогнішчы!

— Дзякуй, каханы, суцешыў!

— Што ўмею, то ўмею! Паімчалі!

Машыну ўдалося прыпаркаваць толькі метраў за сто ад Палаца спорту. Распрануўшыся і прайшоўшы два бар'еры аховы, мы размясціліся на сёмым радзе партэра. Месцы элітныя, і на кожным крэсле ляжала бірулька з ліхтарыкам. Дробязь, а прыемна. Я агледзеўся. Шмат моладзі, але хапала і старых рокераў з доўгімі, пасівелымі ад змагання са сценамі валасамі. Многіх я ведаў, мы абмяняліся кіўкамі і сяброўскімі ўзмахамі рукі. Rock forever!

— Ого, колькі ў цябе знаёмых! — усклікнула Тома.

— Старая рокерская гвардыя.

Але я ведаў, што няма ўжо з намі цудоўнага бас-гітарыста Рэда, якога, прыкаваўшы наручнікамі да батарэі паравога ацяплення, забіў насмерць садыст-санітар Чэсь з Навінак. Няма летуценнага, з дзіцячай усмешкай на твары Янэка. Яго застрэлілі ў падземным пераходзе скінхэды, калі ён спяваў свае меладычныя рок-балады і спрабаваў зарабіць хоць якія грошы, каб купіць лекі для хворай маці. Прыгажуня Наста, чый нізкі хрыплаваты голас разбіў не адно мужчынскае сэрца, прыняўшы дозу, спрабавала паляцець у вырай з даху дзевяціпавярхоўкі.

Не даляцела... Жыццё зламае яшчэ не аднаго з нас, але мы будзем працягваць разбіваць сцены... Каханне і рок зламалі Жалезную заслону Савецкага Саюза і Берлінскую сцяну. Засталіся яшчэ дзве самыя моцныя: Крамлёўская і Кітайская.

Канцэрт затрымліваўся. Асістэнты перасоўвалі калонкі, падключалі ўзмацняльную апаратуру, правяралі святло. Але вось на сцэну выбеглі музыкі, зайгралі ўступ, перад намі з'явіўся цыбаты юнак і заспяваў песню на рускай мове. І хоць музыкі рабілі рыфавыя хады і выціскалі са сваіх гітар усё магчымае, гэта быў не рок, а папса, замаскіраваная пад рок. Штампаванае дзіця расійскай «Фабрыкі зорак» спрабавала разагрэць публіку. Гэта было раўназначна спробе ўзбудзіць старога наркамана мятнымі цукеркамі. Спеўшы некалькі песень і адпрацаваўшы мізэрную частку ўкладзеных у яго грошай, фабрычны дзетдомавец пад рэдкія плясканні далоняў зліняў са сцэны.

— Зміцер, а якой ён арыентацыі? — шапнула мне на вуха Тома.

— Кіркораўскай.

Яна аж пырснула і ўткнулася тварам у маё плячо, каб адсмяяцца.

Цяпер за справу ўзяліся прафесіяналы. За пятнаццаць мінут зладжанай працы яны стварылі дызайнерскі шэдэўр: пасярэдзіне сцэны на п'едэстале з'явілася шыкоўная ўдарная ўстаноўка, на задніку былі размешчаны мультымедыйныя экраны, а зверху зіхацеў неонам фірмовы надпіс «Scorpions». Рознакаляровыя пражэктары выхапілі постаці легендарнай пяцёркі, загучалі першыя акорды — і пачалося Свята. Хлопцы (некаторым з якіх было за 60) літаральна жылі рокам. Невысокі Клаус Майнэ ў фірмовай кепцы, надзетай казырком назад, сваім палётным металічным тэнарам здзіраў скуру з цела і прымушаў нервы вібраваць у адной з ім танальнасці. У перапынках паміж песнямі ён шпурляў у глядзельную залу барабанныя палачкі. Пад зайздрослівыя погляды суседзяў мне пашчасціла злавіць адну з іх. Вось гэта сувенір! Музыкі трымалі сябе абсалютна свабод-

на і раскавана, яны пілі піва, размаўлялі з гледачамі, жартавалі, распраналіся, абліваліся вадой.

Вось дзяўчына з кветкамі ў руцэ паспрабавала выбегчы на сцэну. Гарылападобны амапавец перахапіў кволае дзяўчо і, заламаўшы рукі, паспрабаваў вывесці. Што тут пачалося! Музыка спынілася. Клаус падышоў да мікрафона і пачаў нешта ўзбуджана гаварыць па-англійску. Перакладчык сказаў: «Музыкі заяўляюць, што, калі дзяўчыну не адпусцяць, канцэрт спыніцца». Аглушальны свіст пранёсся па зале. Гледачы танцполу пачалі тупаць нагамі і рассоўваць бар'еры, спрабуючы прыйсці на дапамогу дзяўчыне. Спалоханы амапавец выклікаў па рацыі падмогу. Ды што яны маглі зрабіць супраць раз'юшанага натоўпу? Прыйшлося адпусціць дзяўчыну, і тая пад крыкі «Брава!» выбегла на сцэну і трапіла ў абдымкі «Скорпаў». Рудольф Шэнкер вынес стул, і апошнюю частку канцэрта шчаслівая дзяўчына правяла побач з легендарнымі музыкамі. «Скорпы» не ідуць на кампраміс. Яны адмянілі канцэрт у Маскве, калі там не захацелі зняць першыя — алігархавыя — рады партэра і ўсталяваць танцпол для моладзі.

Канцэрт працягваўся: хард-баевікі змянялі рок-балады. І калі Клаус заспяваў свой мегахіт «Still loving you», які на дзесяцігоддзі падзення Берлінскай сцяны «Скорпы» выконвалі разам з сімфанічным аркестрам і легендарным Мсціславам Растраповічам, зала ўстала і, узняўшы запаленыя бірулькі-ліхтарыкі, пачала падпяваць:

— If we'd go again
All the way from the start
I would try to change
The things that killed our love.

Калі б было магчыма
Зноў прайсці гэты шлях,
Я б змяніў тое,
Што забіла нашае каханне.

Свабода і каханне! Каханне і свабода! Вось дзве рэчы, дзеля якіх варта жыць!

Пасля канцэрта я адчуваў адначасова і небывалую лёгкасць, і нейкае душэўнае спусташэнне, якое наступае, калі тое, чаго ты так доўга чакаў, становіцца мінулым.

— Томачка, давай не пойдзем у рэстаран, а паедзем да мяне. Пасля людскога натоўпу так хочацца цішыні.

— Як скажаш, каханы.

Мы заехалі ў «начнік», купілі піцу, смажаную рыбу, мой любімы пармезан, масліны, велічынёй з перапяліныя яйкі, якія так падабаліся Томе, зеляніну, садавіну і пакунак «Сталічных» цукерак. Музычную страву найвышэйшай якасці хацелася дапоўніць ежай такога ж гатунку. Дома я дастаў з бара бутэльку сапраўднай хванчкары, якую мне прывезлі з Грузіі, і пакуль Тамара пераапраналася і прымала душ, накрыў на кухні стол, запаліў свечкі і ўключыў падсветку ў акварыуме. Сябар, фанат рыбак, дапамог і мне захварэць на гэтую справу. У вялізным насценным акварыуме жылі рыбкі памерам з далонь, на дне быў прыгожы грот, патануўшая брыганціна, грэчаскія амфары, куфар з залатымі дублонамі і нават чэрап пірата. Непрыстойна прыгожыя кобальтавыя і залатыя дыскусы, — каралі акварыумаў з ручаёў і азёр далёкай Амазонкі, — каштоўнымі поўнямі плавалі сярод раслін. Мой улюбёнец па мянушцы Золата Ацтэкаў заўважыў мяне і ўсплыў на паверхню, патрабуючы пачастунку. Прыйшлося даць яму сухую крэветку, якую ён далікатна ўзяў з маіх пальцаў. Апрануты ў цяльняшку сомік-панак, падобны на дагістарычную істоту, сваім ротам-прысоскам прысмактаўся да сценкі акварыума і ў поўнай прастрацыі вісеў уніз галавой. Медытуе! Паласатая, з упартым бычыным ілбом каралева афрыканскага возера Танганьіка корпалася ў грунце і спрабавала выдраць расліну. Вось зараза! Колькі раслін яна мне папсавала! Я ручкай сачка паспрабаваў адпіхнуць яе, але ўпёртая, як, пэўна, усе афрыканскія каралевы перыяду матрыярхату, рыбка імгненна схавалася за амфару. Вазьмі мяне цяпер за руп дваццаць! Жоўтыя цыхліды-калібры сонечнымі праменьчыкамі праносіліся сярод смарагдавай зеляніны і ўносілі ажыўленне ў памяркоўнае жыццё насельнікаў акварыума.

Лепшай рэлаксацыі, чым, уключыўшы якасны запіс з гукамі жывой прыроды, паўгадзіны паназіраць за рыбкамі, я не ведаю. Вядома, калі побач няма каханай жанчыны.

Прыйшла Тома ў купальным халацiку, і адразу на кухні стала па-хатняму цёпла і ўтульна.

— Як прыгожа, Зміцер! — замілавана ўсклікнула яна.

— Ты тут самая прыгожая залатая рыбка!

Я адкаркаваў бутэльку і наліў у крыштальныя бакалы амаль чорнае, як кроў дракона, віно.

— За нас, Томачка!

— За наша каханне!

Паволі, каб адчуць непараўнальны смак любімага віна, я зрабіў першы глыток — лёгкі ветрык данёс водар горных лугоў Каўказа. Я запомніў гэты водар і «сцёр» яго маслінай. Другі глыток — і сіні арол у бяздонна-блакітным небе праляцеў над бясконцымі вінаграднікамі. Цяпер кавалачак сулугуні з кінзой. Трэці глыток — і вогненна-барвовы дыск сонца паволі патануў у фіялетавым моры. Ягада кардзінала і апошні глыток — Ніко Пірасмані з рогам віна ў руцэ заспяваў на вяселлі. Спеў падхапілі — і непараўнальнае грузінскае шматгалоссе разнеслася над горным аулам. І калі маладое бажоле — гэта першы пацалунак, такі няўмелы і такі незабыўны, а бардо — тэмперамент і вытанчанасць француженкі, то хванчкара — гэта шматгалосы акапэльны канон.

— Зміцер, паспявай, калі ласка, — папрасіла Тома.

Я прынёс з залы сваю майстровую акустыку, якая была для мяне жывой істотай і з якой я вітаўся кожную раніцу і цалаваў нанач. Пачнём з «Yesterday». (Працуючы над гэтай песняй, Пол Макартні не ведаў, што стварае шэдэўр стагоддзя, які можа расчуліць любую жанчыну.) Цяпер «Купалінку» і «Ой, сівы конь бяжыць…». Яны не горшыя. Тома ціхенька падпявала. Мы пілі віно, пелі песні і цалаваліся. Што можа быць лепш?

Пасля, у ложку, Тома шапнула: «Зміцер, дзякуй за шчаслівы вечар! Ты сёння быў такі пяшчотны. Давай пажэнімся, я нараджу табе хлопчыка і дзяўчынку». Я хацеў адказаць: «Арлы

ў няволі не размнажаюцца», але гэта было б занадта пошла... Таму я прашаптаў: «Добра, Томачка, вось зраблю адну справу і пажэнімся». Я ціхенька гладзіў жаночыя валасы, спіну і ягадзіцы, якія ад дотыку маіх пальцаў пакрываліся пупырышкамі, як маладыя гурочкі, да тае пары, пакуль шчаслівая і стомленая Тома не заснула. Пакуль жанчына будзе засынаць першай, у вас у ложку будзе поўная гармонія. Гэта аксіёма.

А мне не спалася. Я думаў пра загадкавы факс. Стужка памяці пачала адкручвацца назад. Першы курс універа. Мы з сябрамі, наслухаўшыся «Бітлоў» і пабываўшы на канцэртах «Чырвоных гітар» і «Трубадураў», захацелі стварыць уласны гурт. З адным з выкладчыкаў мы прыйшлі да паразумення, і ён, паабяцаўшы дэкану наш актыўны ўдзел у грамадскім жыцці факультэта і ўзяўшы на сябе незайздросную ролю кіраўніка нашага ВІА, дапамог прабіць сякую-такую апаратуру і музычныя інструменты. У большасці з нас за плячыма была музычная школа па класе баяна або фартэпіяна, але гітару асвойвалі самастойна. Вакалу і ансамблевым спевам нас вучылі, таму трохгалосныя акорды будавалі лёгка. Жаданне стаць рокерамі было настолькі вялікім, што ўжо праз два месяцы мы выступалі на вечарынах. Назву «Мішка касалапы» ўзялі са слоў адной з дзіцячых песенек, якую перапрацавалі ў стылі рок. Хутка мы сталі лаўрэатамі конкурсу патрыятычнай песні і набылі вядомасць у студэнцкіх колах. «Мішак» пачалі запрашаць на вяселлі і ў рэстараны. З'явіліся першыя грошы і першыя спакусы. Пра наркотыкі мы тады яшчэ не ведалі, але алкаголь быў спадарожнікам амаль кожнага выступлення.

Развязка адбылася на навагодняй вечарыне, куды чорт прынёс камітэт камсамола амаль у поўным складзе. У нашага перкусіяніста Валеры ў вялікім барабане, як звычайна, стаяў саквояж з «чарнілам». Перад канцэртам мы зайшлі ў адну з аўдыторый і прынялі для разагрэву па бутэльцы «сонцадару». Было калісьці такое дваццаціградуснае пойла, пры адным успаміне аб якім мяне нават зараз бяруць дрыжыкі. Пра яго нават склалі вершык: «Не губляйце часу дарам, пахмяляйцесь «сон-

цадарам»! Карацей, на пачатку танцавальнай вечарыны мы, як, дарэчы, і большасць студэнтаў, былі на добрым уздыме. Перад намі спрабавалі іграць хлопцы з гістарычнага факультэта на сямiструнных гітарах, але іх абсвісталі і пачалі патрабаваць: «“Мішкі»! «Мішкі!”» Мы, вядома, урэзалі! Бітлоўская «Back in the USSR» гімнам свабоды грымела ў фае. Адзін са студэнтаў у экстазе схапіў за нос гіпсавы бюст правадыра сусветнага пралетарыяту Леніна і пачаў танцаваць з ім твіст. Я бачыў, як ад падобнага нахабства вырачыў вочы нізкарослы старшыня камітэта камсамола, як з’явіліся дружыннікі.

— Спыніце музыку! — закрычаў адзін з камітэтчыкаў.

— Адсасі! — выгукнуў Валера. Ён цішком паспеў засандаліць з горла другую бутэльку «чарніла» і цяпер быў гатовы змагацца нават з ордамі Чынгісхана.

Мы працягвалі іграць. Нас абступілі дзяўчаты з хлопцамі і, стварыўшы кола, абаранялі ад насядаўшых дружыннікаў. Пачалася бойка. Нехта з камітэтчыкаў выдзернуў з разеткі штэпсель ад узмацняльнікаў. Музыка змоўкла. Раптам раздаўся страшэнны грукат: бюст Леніна зваліўся з пастамента і разляцеўся на сотні кавалкаў. Моладзь аслупянела, а потым кінулася наўцёкі. Мы засталіся, бо трэба было ахоўваць апаратуру.

Расправа была суровай. Праз дзень нас выклікалі на пашыранае пасяджэнне камітэта камсамола ўнівера з удзелам прадстаўнікоў партыйнай арганізацыі. Чаго мы толькі ні выслухалі! Нас аб’явілі прадстаўнікамі буржуазнай ідэалогіі, п’яніцамі і чужароднымі элементамі, якія псуюць савецкую моладзь. Мы маўчалі і радаваліся, што зараз не трыццаць сёмы год. З універсітэта нас выключылі, праўда, з правам аднаўлення. Я пайшоў у войска, сябры зрабілі тое ж самае. Праз два гады я аднавіўся, перайшоў на завочнае, і з тае пары нашы шляхі-дарожкі разышліся…

Раніцай я прыняў кантрастны душ, зварыў каву, зрабіў тосты з вяндлінай і сырам і на століку падкаціў да ложка. Разбудзіўшы Тому пацалункам, прадэкламаваў:

— Вось і верас ужо зацвіў, мая каханая!
Пікты каву шлюць табе, мая жаданая!

— Ой, Зміцер, як прыемна! Вось бы так кожную раніцу! Пачакай, я на хвілінку ў душ.

Потым мы снедалі, потым Тома як бы незнарок адкінула коўдру, і я, не вытрымаўшы спакусы, цэлую гадзіну па пагорках і лагчынах вывучаў геаграфію любімага цела. Потым мы задрамалі, потым я зноў зварыў каву і, каб больш не паддацца спакусе, зацягнуў Тамару пад душ. Абняўшыся, мы нежыліся пад цёплымі ласкавымі струменямі, і я цішком уключыў халодную ваду. Тома з віскатам кошкі, якой адсеклі хвост, трэснула мяне мачалкай і выскачыла з ванны.

— Ты звар'яцеў! Я табе не эскімоска! Заб'ю!

— Ружжо на гарышчы. Прабач, каханая, але так мы ніколі не трапім на працу. Ты, можа, забылася, што я твой шэф і сёння рабочы дзень? І, наогул, калі хочаш быць маёй жонкай, то павінна загартоўвацца разам са мной. Ты мне даруеш? Мір?

— Я падумаю... Сапраўдныя жанчыны адразу не даруюць. Я на цябе пакрыўдую. Гадзіны дзве.

— Гадзіну, і вечарам я вяду цябе ў Купалаўскі.

— Згода!

Падабаецца мне Томіна ўменне хутка забывацца на крыўду. Мы, мужыкі, часам здатны на неабдуманыя ўчынкі, і калі жанчына не ў стане іх дараваць, то лепш не быць разам, бо жыць з вечным пачуццём віны немагчыма. Успрымайце нас такімі, якія мы ёсць, дарагія жанчыны, і помніце, што анёлы па грэшнай зямлі даўно ўжо не ходзяць.

Я адвёз Тому ў офіс, даручыў займацца бягучымі справамі, а сам заехаў у прыёмную рэктара ўнівера. Сакратарка, спытаўшыся, па якой я справе, уручыла мне канверт. Я раскрыў яго, дастаў ліст і прачытаў наступнае: «Зміцер, у студэнцкія гады я была фанаткай вашага гурту (можа, успомніце рыжавалосую дзяўчыну, якая глядзела на Вас зачараванымі вачыма, але пазнаёміцца так і не набралася смеласці). Мне хочацца,

каб вы прадоўжылі той навагодні канцэрт, пасля якога вас незаслужана разагналі. «Мішкі» маглі вырасці ў гурт высокага ўзроўню. Калі Вы збераце сваіх сяброў і выступіце з канцэртам, я заплачу вам дзесяць тысяч долараў. Для рэпетыцый арандую залу з апаратурай. Ваша прыхільніца Наста. З усімі праблемамі і пытаннямі звяртайцеся да мяне па наступным тэлефоне...»

Та-ак, даволі нечаканы працяг. Дзяўчыну я ўспомніў. У любога гурту ёсць хаця б некалькі такіх адданых, калі не сказаць — фанатычных прыхільніц. Яны ходзяць на ўсе канцэрты, глядзяць замілаванымі вачыма і гатовы выканаць любое жаданне. Паўтараю — любое. Некаторыя з маіх сяброў гэтым карысталіся, але я ніколі не забываў слоў Экзюперы, што мы ў адказе за тых, каго прыручылі. Ад бацькоў-настаўнікаў я засвоіў некалькі табу, якіх не парушаў ніколі ў жыцці. Не крыўдзіць наіўных і даверлівых было адным з іх. А тая дзяўчынка Наста была светлым і эмацыянальным стварэннем. З такімі не спяць, на іх нават жаніцца страшна, бо кумірам лепш быць на адлегласці, а самае балючае ў жыцці — гэта разбітыя ілюзіі...

Што рабіць? Да канцэрта заставаўся месяц. Ці ў стане я за гэты час сабраць былых сяброў, кожны з якіх даўно жыве сваім жыццём, і аднавіць праграму? Пра грошы я не думаў, хаця і яны не будуць лішнімі. Проста Наста ўгадала маё патаемнае жаданне: выступіць перад былымі выкладчыкамі і даказаць, што і мы нечага вартыя. І яшчэ — мне падабаюцца складаныя задачы.

Вярнуўшыся ў офіс, я адкрыў ноўтбук і зайшоў на сайт «vKontakte». Праз некалькі хвілін адрасы сяброў былі занатаваныя. Барысаў, Лепель, Полацк і Віцебск — такім будзе маршрут майго падарожжа ў мінулае... Але яно пачнецца заўтра, а сёння мы з Томай ідзём у тэатр. Вядома, у Купалаўскі, бо толькі ў ім існуе тая непаўторная аўра, якая стваралася дзесяцігоддзямі геніяльнай акцёрскай ігры. Мне пашчасціла: ішлі «Страсці па Аўдзею» — адзін з любімых спектакляў. Ігра Генадзя Аўсянікава была на недасяжнай вышыні. Ён самы арганічны акцёр, якіх я ведаю, а ролі, дзе дзевяноста адсоткаў гумару, а дзесяць — трагізму, быццам спецыяльна напісаныя для яго.

Па маёй скуры неаднаразова бегалі мурашкі, а Тома сціскала маю руку, каб не расплакацца. Я ўжо даўно вынайшаў для сябе лакмусавую паперу на вызначэнне якасці мастацкага твора: калі па скуры прабеглі мурашкі — гэта сапраўднае мастацтва, не — падробка.

Адзінае, што мне не падабаецца ў Купалаўскім — гэта буфет. Ён стандартны і безаблічны. Вось каб ён быў аформлены ў беларускім стылі, каб там смажылі дранікі, падавалі мачанку, верашчаку, поліўку з грыбамі і медавуху, тады б уражанне ад спектакля было больш поўным, бо нацыянальнае мастацтва павінна дапаўняцца нацыянальнай кухняй. Унутраны голас мяне ацвярэзіў: «Ты што, у тэатр жраць ідзеш? Для гэтага існуюць установы грамадскага харчавання. А ў тэатры ежа духоўная, таму глядзі дзейства, падсілкоўвай душу станоўчымі эмоцыямі і не вякай, гурман саматужны!»



# Падарожжа першае. Валера

Раніцай «Пежо» імчаў мяне на Барысаў да нашага барабаншчыка Валеры. Некалі мы разам з ім жылі на кватэры. За колькі месяцаў да таго, як наш гурт разагналі, ён пачаў прыводзіць да сябе студэнтку Люду з трэцяга курса. Я адварочваўся да сцяны і з галавой накрываўся коўдрай, каб не чуць скрыпу расхістанага ложка і стрыманых стогнаў. Потым Люда зацяжарала і, узяўшы акадэмічны адпачынак, паехала да Валеры ў Барысаў. У іх нарадзіўся сын, якога яны ў мой гонар назвалі Дзімам, патлумачыўшы, што я прысутнічаў пры зачацці. З тае пары прайшло больш дваццаці гадоў. Першы час мы яшчэ зрэдку сустракаліся, а потым віры жыцця засмакталі кожнага ў сваю варонку. Чаму так лёгка сябруецца ў юнацтве і так цяжка ў сталасці?

Я разважаў над гэтым, пакуль не даехаў да моста праз Бярэзіну, якая велічна несла свае свінцова-шэрыя хвалі. Недалёка ад гэтага месца, ля вёскі Сцюдзёнка, Напалеон страціў сваю армію. Загінуўшых было столькі, што сяляне ўсяго Барысаўскага павета, якіх сагналі на прымусовыя работы, амаль тыдзень хавалі целы. Малодзенькіх французскіх дзяўчат сяляне прадавалі па дзесяць злотых, а маленькіх дзяцей аддавалі задарма. Жонкі загінуўшых афіцэраў, каб не памерці з голаду, станавіліся прасталыткамі. А колькі кладаў хаваюць гэтыя берагі! Вось бы знайсці якую-небудзь старажытную карту, набыць добрую апаратуру і стаць кладашукальнікам. Але ўнутраны голас вярнуў мяне з аблокаў на зямлю : «Ты хаця б ру-

бель у жыцці выйграў? Знайсці ты можаш, у лепшым выпадку, бляшанку, а ў горшым — іржавую міну Другой сусветнай, і гэта будзе тваёй апошняй знаходкай... Так што не з вашым шчасцем, сэр!»

Праз некаторы час я пад'ехаў да знаёмага дома на ціхай вулачцы Барысава. Будынак ужо даўно патрабаваў рамонту, а сад — абрэзкі. Ля тратуара было прыпаркавана некалькі машын. Я ўзышоў на ганак і націснуў на кнопку званка. Маўчанне. Пацiснуў клямку — дзверы паддаліся. Я зайшоў у калідор, адчыніў яшчэ адны дзверы, і першае, што ўбачыў, — гэта партрэт Валеры, перавязаны чорнай стужкай, запаленую свечку, агонь якой пасля майго ўваходу задрыжэў і ледзьве не згас, жалобны стол і змарнелую Люду ў чорнай хустцы. Яна падбегла да мяне, абняла і загаласіла: «Вось і сябра да цябе прыйшоў, Валерачак! А ты ж нікога не хацеў трывожыць сваімі праблемамі, хацеў усё вырашыць сам, ды не паспеў...»

— Калі гэта здарылася?

— Сёння сорак дзён.

— Чаму мне не паведаміла?

— Валера забараніў. Ён хацеў, каб сябры помнілі яго маладым і прыгожым. А на ім жывога месца не было, так яго збілі. Яшчэ двое сутак праляжаў у рэанімацыі. Дактары здзіўляліся, што ён яшчэ жыў. З сынам хацеў развітацца. Дачакаўся.

Да мяне падышоў юнак, з-пад расшпіленага каўняра якога віднелася блакітная цяльняшка.

— Добры дзень, дзядзька Зміцер. Я ваш цёзка і хроснік.

Мы абняліся.

— Пойдзем да стала, памянём тату. Усе пытынні потым.

Калі ўсе разышліся і мы засталіся ўтраіх, Люда сказала:

— Ты ж ведаеш, што характар у Валеры быў не з лепшых: любіў ён рэзаць праўду-матку ў вочы кіраўніцтву. З гарэлкай таксама былі праблемы, таму на працоўных месцах падоўгу не затрымліваўся, і часцяком мы жылі на маю настаўніцкую зарплату. Год назад ён вырашыў разбагацець і падаўся ў гандляры. Закупаў на аптовым рынку садавіну і гародніну і перапрадаваў.

Справы ішлі нядрэнна. З гарэлкай «завязаў». За год сабраў грошы на патрыманае аўто, падарыў мне футра, Дзіму — камп'ютар. А потым адзін «добразычлівец» падбухторыў яго закупіць вялікую партыю курыных ножак Буша, абяцаючы небывалы навар. Валера пазычыў пад працэнты дзесяць тысяч долараў. Калі ножкі пачалі размарожвацца, аказалася, што яны тухлыя. Усю партыю прыйшлося закапаць. Ён прадаў усё, што мог з маёмасці, але гэтага, вядома, не хапіла, каб разлічыцца. Гандляр, у якога Валера пазычыў грошы, наняў браткоў. Тыя наехалі раз, другі, а потым прызначылі яму апошні тэрмін. Валера мне пра гэта сказаў толькі на бальнічным ложку. Учора пасля работы перанялі і мяне, патрабуюць, каб афарміла на аднаго з іх вось гэтую хату, інакш абяцаюць спаліць яе разам са мной.

— Я пазабіваю гэту сволату! — заскрыгатаў зубамі Дзіма.

— Што ты, сыночак! — загаласіла Люда. — Цяпер ты адзін у мяне застаўся. З гэтымі бандытамі міліцыя не ў стане справіцца, а што ты можаш зрабіць?

— Пачакайце, — сказаў я. — Як завуць галоўнага тых, хто да цябе падыходзіў?

— Анзор, ён часта на базары круціцца.

— Колькі грошай яны патрабуюць?

— Дзесяць тысяч, бо Валера аддаваў толькі працэнты. Тэрміну далі два тыдні.

— Не хвалюйся, Людачка, мы нешта прыдумаем. Я вас не пакіну, пакуль мы не вырашым гэту праблему. А зараз давайце класціся спаць.

Перад сном я выйшаў на вуліцу, зрабіў званок старому сябру, аўтарытэтнаму ў крымінальных колах, і папрасіў дапамагчы разруліць гэтую праблему. Ён абяцаў заўтра прыехаць. Вядома, не адзін.

На наступны дзень мы з Дзімам дапамагалі Людзе разабрацца з хатнімі справамі. Бліжэй да абеду патэлефанаваў Худзенькі (гэта было паганяла майго знаёмага) і прапанаваў сустрэцца. Я пад'ехаў на прызначанае месца і перасеў у шыкоўны «бумер». Худзенькі — двухметровы качок — паціснуў мне руку

і сказаў: «Нялёгка гаварыць з каўказцамі — занадта многа ў іх пыхі. Яны гатовы адкласці тэрмін на месяц, але грошы трэба аддаць. Такі закон».

— Дзякуй, сябра, грошы пастараемся знайсці. Як я з табой разлічуся?

— Праспяваеш «Гатэль Каліфорнія» на маім дні нараджэння.

— Дамовіліся!

Я вярнуўся ў дом на ціхай вулачцы. Дзверы гаража былі адкрытыя, я зайшоў туды. Дзіма корпаўся ля ўдарнай устаноўкі. Ого! Ды гэта ж наша студэнцкая Амаці! Нам удалося выкупіць яе пасля спісання. Вунь той маленькі том-том мы выкарыстоўвалі ў якасці шклянкі, і чырвоны колер таннага «чарніла» назаўсёды ўеўся ў пластык.

— Што, хроснік, разглядаеш антыкварыят?

— Ды яна яшчэ хоць куды! Я замяніў стары пластык на прыстойны, каб лягчэй было настройваць. Да дзвюх суперцынаўскіх талерак — крэш і райд — дадаў сплэш і чайну. Зрабіў варыянт з адным навясным і двума падлогавымі том-томамі, які выкарыстоўваў кумір майго таты Джон Бонэм з «Led Zeppelin». Каб не купляць другую «бочку», набыў кардан. Бацька недзе дастаў малы металічны прэм'ер. Карацей, поўны апгрэйт. Якасць Semi-Pro! Паслухайце, як гучыць.

Дзіма сеў за барабаны. Спачатку кардан пачаў рытмічна бухаць па бас-барабане, а правая рука круціла між пальцамі барабанную палачку. Гэта было калісьці любімай фішкай Валеры, над якой ён працаваў гадзінамі і якую пераняў яго сын. Збіўка, правая рука пачала адстукваць моцную долю на малым барабане, а левая запаўняла рытмічны малюнак на хай-хэце. Моцны шыпячы гук крэша падкрэслівалі кароткія звонкія акцэнты райда. Што ж — прафесійна і рытмічна. Пачуццё рытму павінна быць у крыві, навучыць яму немагчыма. А яшчэ барабаншчыку трэба мець надзвычайную каардынацыю, бо адначасова працуюць дзве рукі і дзве нагі. Усе гэтыя якасці ў Дзімы прысутнічалі.

— Клёва, сынку, клёва! — пахваліў я яго. — і гук выдатны! А можа, ты заменіш бацьку на нашым канцэрце? Думаю, ён быў бы задаволены.

Я расказаў хлопцу пра будучы канцэрт. Той адразу загарэўся:

— Хросны, вазьміце мяне! Я вас не падвяду! Бацька навучыў мяне ўсяму, што сам умеў. У войску я іграў у гарнізонным гурце.

— А на каго мы пакінем маці?

— Сёння да яе прыязджае родная сястра з Мазыра, абяцалася з месяц пажыць у нас. Думаю, разам ім будзе весялей.

— Што ж, добра. Тады збірай рэчы, заўтра мы едзем.

# Падарожжа другое. Алесь



Дарога да Лепеля была нядоўгай. У галаве чамусьці круцілася мясцовая прыпеўка, якую некалі напяваў Алесь:

Адна баба аглохла,
Другая — аслепла,
І глухая на сляпой
Паехала ў Лепля.

Ужо апоўдні мы з Дзімам заходзілі ў пад'езд абшарпанай трохпавярхоўкі, дзе жыў наш басіст Алесь. Але дарэмна мы званілі ў дзверы яго кватэры — ніхто не адчыняў. Тады я націснуў кнопку званка суседзяў. Дзверы адчыніла жвавая бабуля.

— Прабачце, — сказаў я, — не падкажаце, дзе ваш сусед?

— Ды ў піўнушцы ён ля возера. Два тыдні п'е. Жонка з'ехала да маці, а ён залівае гора. Трэба неяк спыніць Алеся, бо дап'ецца да белых коней. Дапамажыце яму, добры ж хлопец…

— Не хвалюйцеся, бабуля, дапаможам.

Мы нетаропка паехалі ў накірунку аўтавакзала, звярнулі направа, па раздзяўбаным асфальце, з-пад якога дзе-нідзе прабівалася пасляваенная брукаванка, даехалі да рынку. Зноў направа, круг па цэнтральнай плошчы, сто метраў уніз — і мы ля возера. Вецер гнаў пеністы бурун, на якім велічна пагойдвалася пара лебедзяў. Лянуюцца яны ляцець у вырай, вырашылі перазімаваць дома, тым больш што адсюль не так далёка да Новалукомля, дзе ў цёплых водах ЦЭЦ можна сагрэцца ў самы люты мароз. А вунь і піўны шалман, які ведаў лепшыя часы і які, здаецца, забыліся за-

крыць на халодны сезон. Я піхнуў рыпучыя дзверы, і мы з Дзімам аказаліся ў пракураным памяшканні з некалькімі столікамі. За адным з іх «адцягвалася» кампанія, а за стойкай бара сумавала, шчоўкаючы семкі, тоўстая буфетчыца. Алеся я пазнаў адразу. Ён нешта даказваў, нервова размахваючы рукамі, але яго асабліва не слухалі. На стале стаяла некалькі пустых пляшак з-пад гарэлкі і напаўпустых куфляў піва. Баляванне было на той стадыі, калі патрабуецца дабаўка, але фінансы не дазваляюць.

Кампанія мне адразу не спадабалася: гэта былі не бяскрыўдныя алкашы, а чацвёра стрыжаных браткоў, па блакітных наколках на руках якіх можна было вывучаць геаграфію папраўчых установ не толькі Беларусі, але і былога Саюза. Такія ніколі не напіваюцца. Алкаголь для іх — сродак падтрымання нерваў у напружаным стане, каб развесці чарговага лоха. Такім лохам і выглядаў Алесь. Ён узбуджана гаварыў: «Зараз пойдзем да мяне, я знайду грошы, возьмем пойла. Шоу маст гоў он!» Я шапнуў Дзіму: «Трэба выцягваць яго адсюль. Браткі яўна пры нажах, таму страхуй мяне». Мы падышлі да століка. «Прывітанне цёплай кампаніі, — сказаў я. — Алесь, можна цябе на хвіліну?» Ён тупа ўтаропіўся ў мяне. Няголены твар, вочы з чырвонымі прожылкамі і трэмар рук былі няўмольнымі сведкамі двухтыднёвага запою. Нарэшце здагадка прабіла алкагольную заслону, і на твары з'явілася знаёмая ўсмешка. Пачуўся крык: «Зміцер! Брат! Якім ветрам? Рады цябе бачыць!» Мы абняліся, і я адчуў амбрэ перагару, якім можна было б зашкаліць усе тэстары лепельскіх гаёвых.

— Пазнаеш? Гэта Дзіма, сын Валеры, — прадставіў я хлопца.

— Ну ты вырас, хлопча, — усклікнуў Алесь. — Я цябе бачыў апошні раз, калі ты быў зусім маленькім. А дзе Валера?

— Памёр, учора было сорак дзён.

— Вы што?! Не жартуйце так, а то ў мяне сэрца...

— Праўда.

— Як гэта здарылася?

— Потым раскажам.

— Трэба памянуць сябра, але ў мяне...

— Не хвалюйся.

Я падышоў да буфетчыцы, узяў бутэльку гарэлкі, мінералку, некалькі бутэрбродаў з салам і аднаразовых кілішкаў. Разліў гарэлку, сабе і Дзіму — мінералку.

— Давайце памянём нашага сябра Валеру, хай зямля яму будзе пухам, — прапанаваў я.

Усе ўсталі і моўчкі выпілі. Алесь расчуліўся, на вачах заблішчэлі слёзы. Я ведаў, што за гэтым наступіць стадыя слоўнага паносу, таму сказаў: «Алесь, развітайся з хлопцамі, нас чакаюць!»

— Мы яго нікуды не адпускаем, — з ледзь замаскіраванай пагрозай вымавіў адзін з браткоў.

— Чаму? — я ўважліва паглядзеў яму ў вочы.

Ён вытрымаў мой позірк, толькі шрам пад левым вокам нервова таргануўся.

— Абяцаў ён шмат чаго... А па паняццях, за словы трэба адказваць.

— Ён вам вінен грошы?

— Не, справа не ў грашах.

— Алесь, ты хочаш застацца з імі або пойдзеш з намі?

— Я хачу быць з вамі, — прамямліў Алесь, які, здаецца, адчуў небяспеку.

— Тады мы пойдзем!

— Паспрабуйце, — кліент са шрамам падняўся, і разам з ім усталі трое яго сяброў.

Марудзіць далей было небяспечна, таму, непрыкметна кіўнуўшы Дзіму на бліжэйшага да яго зэка, я кінуў пластыкавую бутэльку з мінералкай высокаму амбалу справа ад мяне. Бутэлька ляцела на ўзроўні жывата, і калі ён інстынктыўна яе схапіў, я сякануў рабром правай далоні па яго гусіным кадыку. Не вельмі моцна, каб не забіць, але дастаткова для таго, каб на паўгадзіны вывесці са строю. Пакуль ён, хапаючы паветра, нібы выкінуты на бераг шчупак, спаўзаў на падлогу, я краем вока заўважыў, як Дзіма «двоечкай» даволі прафесійна вы-

рубіў свайго «падначаленага». На мяне кінуўся трэці зэк, я не паспеў адхіліцца, і мы счапіліся ў бліжнім баі. Не люблю я гэтай валтузні, ды што рабіць... Раптам хватка майго праціўніка аслабела, і ён споўз на свайго сябра — гэта Алесь прылажыў яго пластыкавым стулам. Зэк са шрамам адскочыў да сцяны і выхапіў фінку.

— Хросны, ён мой, — выгукнуў Дзіма.

— Справішся?

— А то!

Было бачна, што зэк са шрамам — вопытны баец. Ён прафесійна трымаў нож і заняў зручную пазіцыю, якая абараняла яго ад атакі ззаду. Няўжо ведае нажавы бой? Калі так, то ўзяць яго голымі рукамі будзе ох як нялёгка! Дзіма пачаў збліжэнне з праціўнікам. Краем вока я заўважыў, што буфетчыца, якая на імгненны пачатак бойкі не паспела адрэагаваць, цяпер дастала мабільнік і пачала набіраць нумар. Які, здагадацца было няцяжка.

— Алесь, забяры ў яе мабільнік, — папрасіў я. Сябар, якога сутычка, здавалася, ацвярэзіла, імгненна выканаў загад.

Тым часам Дзіма пачаў атаку: левабаковае *дзёнкутцу-дачы* і ўдар правай рукі *мігі-дзёданг'яку-цукі* ў галаву. Зэк адступіў у *хідары-дзёнкуцтцу-дачы* і нейтралізаваў атаку блокам *хідары-аге-уке.* Далей Дзіма адцягнуў увагу саперніка ўдарам левай нагі *табікондэ-чуданмаё-геры*, развіў яе ўдарам правай рукі *мігі-дзёданг'яку-цукі* і завяршыў імклівым выстралам правай нагі *мігі-дзёдан-маваשы-геры* ў галаву.

— Кія-а-а!

Ад грознага самурайскага покліча сяміпудовая буфетчыца здрыганулася, нібы кволая сцяблінка пад парывам ветру, і выпусціла пакунак з семкамі на падлогу.

Але і зэк не плёў лапці. Ён адступіў у стойку *мігі-дзёнкутсу-дачы*, заблакіраваў удар левай нагі кароткім рубам левай рукі, паспрабаваў зрабіць блок *гёдан-барай,* але змог толькі аслабіць удар, які адкінуў яго на метр убок. Зэк зрабіў глыбокі ўздых, сагнуў галаў і з шумам пачаў выпускаць паветра, аднаўляючыся пасля ўдару:

— Гу-у-у-у-у! Нядрэнна, хлопец, цяпер мая чарга. Трымайся!

Ён некалькі разоў, збіваючы ўвагу Дзімы, перакінуў нож з адной рукі ў другую. Пры гэтым глядзеў не на нож, а ў вочы хлопцу. Я спалохаўся. А калі... Не дай бог!

— Дзімка, дапамагчы?

— Не трэба. Я сам.

Голас у хлопца быў спакойны. Ён гаварыў коратка, эканомячы дыханне, і я супакоіўся.

Тым часам зэк перакінуў нож у правую руку, для адцягнення ўвагі нанёс левай рукой удар *хідары-дзёдан-г'яку-цукі* ў галаву і імкліва выкінуў правую руку з нажом. Цэліў у сэрца.

Дзіма адступіў на крок, пад удар левай паставіў блок *дзёдан-хіджэ-уке,* зрабіў рэзкі выпад левай нагой назад, павярнуў корпус управа, прысеў, левым плячом адбіў руку з нажом і секанув па ёй рабрыной далоні. Як ні дзіўна, зэк нож утрымаў. Эх, на залом трэба было браць руку, на залом!

— Бачу, прапаршчык Мурашка яшчэ служыць, — выгукнуў зэк.

Дзіма ад разгубленасці ледзь не страціў увагу, за што быў пакараны нечаканым ударам нажа, які распаласаваў яму куртку.

— Ты забыў першае правіла прапаршчыка Мурашкі. Нагадаць табе яго або сам успомніш? — з'едліва спытаў зэк.

— Не губляй канцэнтрацыі ўвагі да канца паядынку, — адказаў Дзіма.

— І сачы за вачамі праціўніка, а не за рукамі. Правіла другое.

— Слава ПДВ! — крыкнуў Дзіма.

— Слава! — адказаў зэк.

Яны спынілі паядынак, зрабілі дэсантнае прывітанне і абняліся.

— Як ты аказаўся ў гэтай кампаніі? — спытаў Дзіма.

— Доўга расказваць. Афган. Нашу Віцебскую кінулі першай. Колькі хлопцаў палягло! Раненне, палон, пабег. Допыты асабістаў. Камісаванне. Немагчымасць знайсці працу. Ліхія дзевяностыя. І гэтак далей...

— І што, назад шляху няма? Ці няма жадання? — спытаў я.

— Чаму? Дома чакаюць жонка з дачкой, ды вось звязаўся з гэтымі пасля Оршы…

— А ты развяжыся, мы табе дапаможам.

— Было б добра, але як?

— Пачакай!

Я падышоў да буфетчыцы, дастаў з партманэта сто баксаў і паклаў перад ёй на стойку.

— Давайце дамовімся: вы нас не бачылі, а гэта вам за хваляванне.

— А што я буду рабіць з гэтымі? — яна кіўнула галавой на трох зэкаў, якія «адпачывалі» на падлозе.

— Не хвалюйцеся, мы іх адсюль вынесем.

— Тады лады.

Яна спрытна схапіла сотню і схавала паміж сваіх неабсяжных грудзей.

— Мальцы, працуем! — загадаў я.

Мы схапілі першага зэка за рукі і ногі і вынеслі да возера. На двары ўжо сцямнела, і ніхто нас не бачыў.

— Аднясём яго вунь у тыя кусты, — прапанаваў я.

Тое ж мы зрабілі з астатнімі. Апошні зэк ачуняў і спытаўся: «Дзе я?»

— У Карагандзе, — адказаў Дзіма, вырубіўшы яго лёгкім ударам.

Калі мы садзіліся ў машыну, то ўбачылі, як буфетчыца хуценька зачыняла сваю піўнуху і вешала шыльду «Зачынена на перападлік». Малайчына, кумекае.

— Цябе як завуць? — спытаў я зэка са шрамам.

— Міколам.

— Мы абодва Дзімы, а гэта Алесь.

— Ды ўжо ведаю, — усміхнуўся Мікола. — Вы за ім прыгледзьце, а то яго зараз любы наркот кіне.

— Мяне? Ды нізавошта на свеце! — ускінуўся Алесь. — Я сам каго хочаш у лапці абую.

— Малайчына. Толькі зараз памаўчы.

— Адкуль ты родам? — спытаў я Мікалая.

— Ды з Новалукомля. Недалёка адсюль.

— Даведка ў цябе ёсць?

— Ёсць, з гэтым усё ў парадку — толькі ўчора адкінуўся.

— І ледзь не паспеў зноў заляцець... Вось што мы зробім: я зараз адвязу цябе на аршанку. Там сядзеш на папутку. Праз гадзіну-дзве будзеш дома. Крамы яшчэ працуюць. Я дам грошай на дарогу і на падарункі жонцы і дачцэ. Згодзен?

— Вядома, згодзен. Але як я з табой разлічуся?

— Арганізуеш для нас добрую рыбалку на Лукомскім возеры.

— Ды гэта раз плюнуць! — павесялеў Мікола. — Будзе і карп, і шчупак, і судак, а магчыма, і вугор. Прыязджайце!

— Абавязкова.

Праз дзесяць мінут мы былі на трасе Лепель — Орша. Я высадзіў Міколу і падаў яму сваю візітоўку і грошы.

— Будуць праблемы з працай — звані: чым змагу дапамагу.

— І трымай гонар віцебскай дэсантуры! — дадаў Дзіма.

— Дзякуй, хлопцы! — расчулена адказаў Мікола.

— Не хлопцы, а мальцы, — паправіў яго я, — мы ж на Віцебшчыне. Бывай!

— Што ж нам з табой рабіць, Алесь? — услых падумаў я, калі мы, развярнуўшыся, зноў вярталіся ў Лепель.

— А што хочаце... Хоць забіце, ды рабіце!

— Малайчына, пачуцця гумару ты яшчэ не страціў, значыць, будзеш жыць. Усім сядзець на месцах — камандаваць парадам буду я!

Я пад'ехаў да трохпавярхоўкі, дзе жыў Алесь.

— Зойдзем на хвілінку да цябе, — прапанаваў я.

— Толькі ў мяне няма вас чым пачаставаць, — збянтэжана прамармытаў Алесь.

— Не хвалюйся, — супакоіў яго я, — я сам цябе буду частаваць. Затое потым адпрацуеш па поўнай.

— Згодны на ўсё.

Алесь дрыжачымі рукамі доўга не мог патрапіць ключом у замок. Нарэшце мы зайшлі ў двухпакаёўку, дзе стаяў горкі пах перагару.

— Сябра, у цябе ёсць чыстая бялізна?

— Знайду.

— Складзі яе вунь у тую сумку, а яшчэ захапі станок для галення, мыла, зубную пасту і пашпарт.

— Слухаю, мой жэнераль!

— На выхад! — скамандаваў я.

Я ўзяў накірунак на льнозавод, потым звярнуў налева, заехаў на паўвостраў Лепельскага возера і спыніўся ля шыкоўнага пансіяната, пабудаванага вядомай медыцынскай фірмай. Мы ўзялі ручную паклажу, зайшлі ў памяшканне і падышлі да адміністратара.

— Можна ўзяць двухмесны нумар на траіх? — спытаўся я.

— Зараз не сезон, таму месцы ёсць. На які час будзеце браць?

— Для пачатку на двое сутак, а там будзе бачна. Яшчэ я хацеў бы заказаць саўну гадзіны на тры.

— Добра, праз гадзіну будзе гатова. Запоўніце бланкі і ідзіце ў свой нумар.

Праз дзесяць мінут мы былі ў прасторным нумары.

— Зміцер, ну ты, блін, даеш — гэта вельмі дарагі пансіянат!

— І вы для мяне дарагія людзі. Таму пашыкуем. Калі вы не супраць, я лягу на канапе, а вы займайце койкі. Распакоўвайце рэчы.

Калі рэчы былі распакаваны, мы сабраліся за сталом.

— Сябра, — звярнуўся я да Алеся, — праз тры тыдні мы павінны выступіць перад студэнтамі і выкладчыкамі ўнівера з той праграмай, якую ігралі на чацвёртым курсе.

— Навошта?

— Ты нічога не хочаш даказаць тым казлам, якія нас разагналі? Многія камсамольскія камітэтчыкі знайшлі цёплыя мес-

цы на кафедрах і абавязкова будуць прысутнічаць на канцэрце. Да таго ж нам заплацяць нядрэнныя грошы.

— А я змагу сыграць ім до-рэ-мі-до-рэ-до? (Сыграць до-рэ-мі-до-рэ-до — значыць паслаць на х.. па-музычнаму. Муз. слэнг.)

— Зможаш! Але для гэтага табе трэба выйсці з запою. Ты хочаш гэтага?

— Хачу завязаць да канца жыцця. Сябры, ведаеце, як мне ўсё абрыдла?! Іншы раз хочацца ў пятлю залезці... На працы мяне скарацілі. Сарваўся. Мая Люська махнула на мяне рукой і з'ехала да маці. Дзяцей нам Бог не даў, таму нікому я зараз не патрэбны...

— Ты нам патрэбны. Абяцаеш мяне слухацца?

— Абяцаю!

— Выпіць хочаш?

— Хачу!

— Крыху пачакай. Дарэчы, сваю знакамітую басуху ты збярог? Я ж памятаю, як старанна ты капіраваў Rickenbacker 4001 Крыса Сквайра з «Yes».

— Паміраць буду, а з ёй не расстануся, бо зроблена ж вось гэтымі рукамі!

— Рукі ў цябе залатыя, а галава...

— Срэбная! — прадоўжыў Алесь.

Мы рассмяяліся.

— Добра. Зараз ідзём у саўну. Бярыце бялізну і за мной! Дарэчы, банныя ручнікі тут ёсць для кожнага.

Мы спусціліся ў фае. Я падышоў да прывабнай адміністраторшы.

— Вы не знойдзеце для нас бярозавы венічак?

— Але ж гэта саўна...

— Правільна, але мы не фіны, а бульбашы, таму мокрае п'ём і мокрым парымся. Да таго ж я тут не першы раз.

Я непрыкметна паклаў у яе журнал 20 баксаў.

— А яшчэ я буду вельмі вам удзячны, калі вы адчыніце дзверы, якія вядуць да возера, і ўключыце святло на пляжы.

— Вы што, будзеце купацца ў такую халадэчу? Ёсць жа басейн.

— Мы маржуем. А яшчэ, калі не цяжка, прышліце да нас афіцыянта з рэстарана.

— Добра.

Яна зацікаўлена паглядзела на мяне. Што ж, жанчынам падабаюцца не толькі прыгожыя, але і непрадказальныя ўчынкі.

Мы зайшлі ў саўну і пачалі распранацца ва ўтульным прылазніку з драўлянымі лавамі, сталом з посудам, халадзільнікам і плазменным тэлевізарам.

— Я першы раз у такой шыкоўнай саўне! — усклікнуў Дзіма.

— А я другі, — дадаў Алесь.

— А дзе быў першы раз?

— У марах...

— Гумарыст ты, Алесь, — сказаў я. — і гэта добра, бо нярэдка пачуццё гумару застаецца апошняй саломінкай, якая трымае нас на паверхні жыцця. Заходзьце, грэйцеся, а я пачакаю афіцыянта.

Хлопцы пайшлі ў парылку. Хутка пачуўся стук у дзверы і ўвайшоў афіцыянт.

— Добры вечар.

— Добры.

— Вось вам перадалі венік. Што будзеце заказваць?

— Дзве бутэлькі «Абсалюта» — пастаўце ў халадзільнік. Самаробны хлебны квас у вас ёсць?

— Для вас знойдзем. Я вас мінулы раз абслугоўваў, помніце?

— Вядома, Юра.

— Нават маё імя запомнілі! — здзівіўся афіцыянт.

— Харошых людзей я заўсёды запамінаю, як, дарэчы, і дрэнных. Беражы сяброў, ведай ворагаў — і дажывеш да ста год. Хто сказаў?

— Можа, Канфуцый?

— Не, гэта я сказаў. Закускі, Юра, на твой густ. Яшчэ чыгунок юшкі, вашай знакамітай з пяці гатункаў рыбы, але такой гарачай, каб слёзы з вачэй капалі. І асабістая просьба: праз гадзіну мне патрэбна шклянка сапраўднага лепельскага мёду. Зробіш? Я не пакрыўджу.

— Ды мой дзядуля пчол трымае. Зробім. Дарэчы, ён хвацкую медавуху робіць. Можа, прынесці?

— Прынясі глечык.

— Добра.

Я зайшоў у парылку. Глянуў на тэрмометр — 90 градусаў.

— Сябры, вы што, збіраецеся тут замярзаць?

— Я не ведаў, дзе рэгулятар, — адказаў Дзіма.

— А мне і гэтага зашмат, — прамармытаў Алесь, з якога ручаямі цёк пот. Хутчэй, не пот, а бражка.

— Алесь, схадзі ў душ, а потым паляжы на лаўцы ў прылазніку. Адпачні, я потым за табой прыйду.

Сябра з яўным задавальненнем выбег з парылкі. Я паставіў рэгулятар на 110 і ў ліпавым цэбры запарыў кіпенем венік. Потым залез на верхнюю паліцу.

— Вось зараз пачнём пакрысе грэцца. Ведаеш, Дзіма, як вызначыць, што цела ўжо сагрэлася і можна парыцца?

— Не.

— Слухай і запамінай. Як толькі з носа капне сем кропель поту — можна брацца за венік. Бачу, ты добра накачаўся ў войску, пастарайся падтрымліваць такую форму.

— Дзядзька Зміцер, а дзе вы засвоілі рукапашны?

— Я ж служыў у разведузводзе, яшчэ нешта помню. Зараз мы з табой павінны вывесці з запою Алеся. Басіст ён класны, некалі на пары вывучыў «Палёт чмяля» і хоць у сярэднім тэмпе, але сыграў. Чалавек ён добры, але слабахарактарны, як казаў Алібабаевіч. Колькі кропель сышло?

— Тры.

— Дабавім яшчэ 20 градусаў. Як?

— Як у парылцы.

— Добра. Зараз у душ. Толькі пад цёплы, каб поры цела не закрыліся.

Спаласнуўшыся, я сеў побач з Алесем.

— Як ты?

— Нешта ўсярэдзіне ўсё калоціцца… і млосна. Піва хачу.

— Піва табе — што мёртваму клізма. Дай руку.

Я праверыў пульс. Крыху паскораны, але роўны.

— У цябе з сэрцам праблем не было?

— Не.

— Будуць. Калі піць не кінеш. Пайшлі ў парылку.

— Можа, не трэба?

— Трэба, Федзя, трэба.

Мы зайшлі ў парылку.

— Гэта ж печ Асвецыма, — усклікнуў Алесь. — Вушы ў трубачку скручваюцца. Я лепш пайду ў прылазнік.

— Не. Вось табе лямцавая шапка, каб вушы не смылелі. Кладзіся на сярэднюю паліцу фэйсам у тэйбл. Малайчына! Зараз крыху ліну бярозавага настою. Як?

— Пячэ! — усклікнуў Алесь.

— Не, сябра, ты не рамантык. Бярозкай жа пахне!

Я пачаў пакалыхваць венік над спінай Алеся. Потым прыклаў яго да шыі, лапатак, прайшоўся па пазваночніку і ягадзіцах. Пачаў злёгку хлопаць венікам па спіне і, нарэшце, захвастаў у поўную моц. Сябар толькі ўскрыкваў і змучана стагнаў.

— Для пачатку хопіць. Дай руку!

Я дапамог Алесю падняцца і выйсці ў прылазнік.

— Сланцы на ногі — і на вольнае паветра!

Праз аварыйны выхад мы трапілі на пляж. Вецер гайдаў адзінокі ліхтар, а за дрыготкім кругам святла таямнічай прастуджанай начной пачварай хлюпала носам возера.

— Пакупаемся!

— Вы што, ахуелі! — закрычаў Алесь. — Я ў ваду не палезу!

— Дзіма, хапай яго за правую руку!

Я схапіў Алеся за левую руку, і мы з Дзімам па пяску правалаклі яго да возера і шпурнулі ў хвалі. З матам, які перар-

вала чарговая хваля, ён знік пад вадой. Я нырнуў услед. Вада халоднымі абцугамі сціснула цела і ненажэрнай чорнай п'яўкай пачала высмоктваць цяпло. Да нагі дакранулася нешта слізкае і халоднае. Б-р-р! Я вынырнуў — на беразе ратавальнай паходняй ірдзеў ліхтар. Побач, фыркаючы і выплёўваючы ваду, сярдзітым вадзяніком вынырнуў Алесь.

— Вяртаемся! — крыкнуў я.

Алесь ірвануў так, што мог бы паспрачацца з самім Усэмам Болтам у хуткасці. Ён першым ускараскаўся на верхнюю паліцу парылкі, распластаўся на гарачых дошках, спачатку ляскаў зубамі ад холаду, а потым, калі выратавальнае цяпло ласкавым подыхам сагрэла цела, аж застагнаў ад задавальнення. Я дадаў яшчэ 20 градусаў. Ніхто не пярэчыў, толькі Алесь пакрыўджана барматаў: «Садзюгі вы. Фашысты».

— Мы не фашысты, — запярэчыў я, — мы з цябе зялёнага змія выганяем, а фашысты ў сярэдзіне вайны, каб праверыць уздзеянне нізкіх тэмператур на арганізм чалавека, праводзілі ў канцлагерах эксперыметры над людзьмі. Яны саджалі зняволенага ў бочку з вадой, куды насыпалі лёд. Калі чалавек губляў прытомнасць, яго спрабавалі адагрэць усімі магчымымі спосабамі. Як вы думаеце, які аказаўся самым дзейсным?

— Бутэлька гарэлкі, — адказаў Алесь.

— Не. Што рускаму кайф, то немцу смерць. Калі мужчыну, які страціў прытомнасць, адагравала аголеная жанчына, і ён, ачуняўшы, быў здольны ўступіць з ёй у палавыя зносіны, то хутка прыходзіў у норму.

— А для чаго гэта рабілася? — спытаўся Дзіма.

— Немцы вынайшлі бамбардзіроўшчык для палётаў на экстрэмальнай вышыні, таму трэба было праверыць уздзеянне холаду на арганізм пілотаў і разнастайныя спосабы адагравання.

— Вынік: пакуль магу, датуль жыву!

— Правільна. Я бачу, ты сагрэўся. Пайшлі ў прылазнік.

На лаўцы я разаслаў прасціну і загадаў Алесю легчы на яе. На сервіраваным стале знайшоў паўлітровы слоічак з мёдам. Адкрыў крышку і панюхаў — цудоўны водар, які ўвабраў у сябе

ўсю духмянасць лепельскіх мурагоў. Зачэрпнуў чайную лыжку салодкага золата і паклаў пад язык. Мёд спачатку падаўся такім рэзкім, што аж засадніла ў горле, а потым растварыўся, не пакінуўшы ў роце аніводнай крупкі — значыць, дыястаза не меней сотні. Клас! Лыжкай стаў набіраць мёд і рукамі размазваць па целе Алеся. Потым пачаў хлопаць далонямі па целе, з цяжкасцю адрываючы іх ад скуры. Мёд пабялеў, пачаў ператварацца ў брудна-шэрую масу і скручвацца ў камякі. Гэты від масажу вельмі працаёмкі, затое эфект ад яго непераўзыдзены, бо мёд выцягвае з арганізма процьму шлакаў і адначасова насычае яго каштоўнымі мікраэлементамі, асабліва каліем... Праз паўгадзіны з мяне градам цёк пот, а скура Алеся стала ружовай, быццам у немаўляці.

— У душ! — загадаў я. — Змывай рэшткі мёду. Потым да стала.

Калі мы селі за стол, я дастаў з халадзільніка бутэльку гарэлкі і наліў у чаркі.

— Мальцы, за нашу сустрэчу!

— За нас! — падтрымалі сябры.

Алесь дрыжачай рукой падняў чарку і з бачным намаганнем, падаўляючы прыступ млоснасці, выпіў. Потым, схіліўшы галаў і зморшчыўшыся, некалькі хвілін чакаў рэакцыі арганізма: прыме ці не? Прыняў.

— Сябры, — прапанаваў я, — спачатку па бутэру з ікрой, а потым імгненна — юшку.

Я наліў з чыгунка ў талеркі духмяны кіпень, сыпануў па жменьцы зяляніны: кропу, пятрушкі, цыбулькі. Асобна паклаў па кавалку рыбы.

— Смачна есці! Наваліся — не падавіся! Сёрбайце!

— Як? — спытаўся я праз пару хвілін, калі драўляныя лыжкі азбукай Морзэ пачалі пастукваць па дну талерак. У адказ пачуў толькі мыканне напоўненых іртоў, якія не хацелі адрывацца ад смакаты і траціць час на размовы.

— Тады яшчэ па талерачцы?

Алесь з Дзімам дружна заківалі галовамі.

— Ну і юшка! — нарэшце змог падаць голас Дзіма. — Грэе не горш, чым саўна, з мяне ўжо не сем, а сямнаццаць кропель капнула.

— Вунь сурвэтка, — падказаў я.

Калі талеркі зноў апусцелі і рыба была з'едзена, я наліў па другой чарцы.

— А зараз вып'ем за наша здароўе пад гэтыя саплістыя маслякі. Заўважце: яны запраўлены самаробным алеем, які робіць адзін прадпрымальнік на дарэвалюцыйнай маслабойцы. Алей не горшы за аліўкавы, а пахне, як вусны каханай пасля шклянкі з'едзеных семак. Вось у гэтым чыгунку сопкая бульбачка. Тут — ружовае сала з часнаком і цыбулькай. Вунь квашаная капустачка з журавінамі. Няхай жыве беларуская гастранамія!

— Табе б лекцыі чытаць наведвальнікам рэстаранаў — смачна расказваеш, — пахваліў мяне Алесь. На гэты раз яго рука з чаркай не калацілася і твар не моршчыўся. Што ж: першая калом, другая сакалом.

— Як сябе адчуваеш? — запытаў я сябра.

— Нараджаюся на свет Божы.

— Ты піў два тыдні, таму, па ідэі, столькі ж часу павінен прыходзіць у норму. Але ў нас няма столькі часу, таму лячыцца будзем па паскоранай методыцы, якую прыдумаў нямецкі доктар для цара Аляксандра, не памятаю каторага.

— Што за методыка?

— Пабачыш. А зараз па трэцяй — за жанчын! Табе, Алесь, чыста сімвалічна трыццаць грам.

— Чаму?

— Каб не было новай п'янкі. І не глядзі так пакрыўджана — ты абяцаў мяне слухацца. А не будзеш слухацца — трапіш у лепельскі філіял Навінак. Якімі сродкамі там лечаць, ты, пэўна, ведаеш.

— Як не ведаць. Гарэлкі там не наліваюць. Сябры расказвалі.

— Вось-вось. І нягледзячы на жорсткую методу лячэння, большасць людзей зноў трапляе туды. Альбо ў магілу... Цяпер

давайце пап'ём кваску і будзем збірацца на бакавую. Ці, можа, вы яшчэ хочаце паплаваць у возеры?

Сябры сціпла адмовіліся. Бутэльку гарэлкі, медавуху, квас і рэшткі мёду я забраў з сабой.

— З лёгкай парай! — сустрэла нас адміністратарша.

— Дзякуй, усё было цудоўна!

Перад сном я патэлефанаваў Томачцы і пажадаў ёй добрай ночы. Потым, аддаўшы арганізму загад прачнуцца праз дзве гадзіны і пажадаўшы сябрам добрай ночы, я праваліўся ў чорна-белую бездань сну. Пасля моцнай стомы каляровыя сны мне не сняцца.

Роўна праз дзве гадзіны я прачнуўся. Ведаў, што Алесь не спіць, таму адкрыў халадзільнік, наліў з бутэлькі чарку гарэлкі і падышоў да сябра.

— Выпі, Алесь, стане лягчэй. Вось так! Заеш мёдам. Добра, а цяпер пастарайся крыху паспаць.

Я прачынаўся праз кожныя дзве гадзіны і паўтараў працэдуру. Толькі пад раніцу змучаны сябар заснуў. Я таксама. Дрыхлі мы да дзесяці гадзін. На сняданак я заказаў нам з Дзімам ёгурт, яешню з беконам і каву, а Алесю курыны булён.

— Я таксама кавы хачу!

— Дусту табе кускавога, а не кавы! У цябе нервы як струны гітары, настроенай на два тоны вышэй, а ты хочаш падкруціць іх яшчэ? Я зараз паеду ў аптэку, куплю заспакойваючы збор траў і якога-небудзь гліцыну. Глушыць цябе моцнымі антыдэпрэсантамі не хочацца. Да таго ж ты добра папаліў кішкі, таму табе трэба нешта абвалакальнае.

— Адкуль ты, сябра, усё гэта ведаеш?

— З уласнага вопыту. Той не творца, хто не праходзіў выпрабавання запоем, а ён, часцей за ўсё, бывае ад нашай незапатрабаванасці… Твае мазгі за гэты час не атрымоўвалі станоўчага інфармацыйна-эмацыянальнага ўздзеяння, таму я куплю дыскаў з камедыямі і пазнавальнымі праграмамі. DVD тут ёсць — будзем выганяць негатыў з тваёй галавы станоўчымі эмоцыямі. Днём пагуляем па лесе, а пасля абеду я паспрабую

арганізаваць рыбалку. Зараз жор у шчупакоў. Адпачывайце і чакайце мяне.

Я заехаў у аптэку, а потым з белай ружай зазірнуў у Дом рамёстваў да сваёй аднакурсніцы Раечкі, якая з моманту адкрыцця ўстановы працавала тут загадчыцай. Мы расцалаваліся, і я ўручыў ёй ружу.

— Дзякуй. Якія людзі! Раз у стагоддзе заглядваюць. Ты пра мяне зусім забыўся, Дзімка!

— Прабач, Раечка! Буду выпраўляцца, а быў я ў цябе пяць гадоў назад.

— Хочаш сказаць, што гэта маленькі тэрмін? І што сто шэсцьдзесят чатыры кіламетры — вялікая адлегласць? Пасля саракоўніка кожны год у нас, жанчын, ідзе за пяць. Вы, мужыкі, не разумееце, як цяжка нам губляць прывабнасць…

— Ты цудоўна выглядаеш!

— Кінь ты свае лісlівыя кампліменты. Я кожны дзень гляджуся ў люстэрка і знаходжу на сваім адлюстраванні шмат непатрэбных дэталяў, а яшчэ іншы раз і ў пашпарт зазіраю…

— А ты глядзі на ўсё з іроніяй і гумарам.

— Толькі гэта і застаецца!

Мы рассмяяліся.

— Каб надаць табе аптымізму, скажу, што праз месяц юбілей універа, мы з «Мішкамі» будзем выступаць на канцэрце, куды я цябе і запрашаю.

— Цудоўна, дзякуй! Няўжо вы збераецеся? Нават не верыцца…

— Пастараемся. Толькі вось Валерку нашага забілі.

— Жах! Я нешта краем вуха чула… А хто ж яго заменіць?

— Сын. Мы з ім за Алесем прыехалі, але той пакуль што не ў лепшым стане.

— Ён жа ў мяне працаваў, вёў гурток разьбы па дрэве. Залатыя рукі ў чалавека. Якія скульптуры рабіў з высахлых дрэў! Але пачаліся запоі, прыйшлося звольніць па ўласным жаданні, бо магло быць горш…

— Калі не будзе піць, возьмеш яго на працу?

— Вядома, вазьму. Пойдзем, пакажу табе нашы багацці.

Яна правяла мяне па пакоях, паказала, як на старажытных кроснах ткуць палатно. Асабліва мяне ўразілі ручнікі.

— А можна ў вас набыць такую прыгажосць?

— Закажы. Дзяўчаты за тыдзень зробяць. Толькі ўзор падыходзячы трэба падабраць. Можа, шлюбны? Пара табе ўжо ачалавечыцца.

— А зараз я не чалавек?

— Не, зараз ты эгаіст. Ажэнішся — станеш чалавекам.

— Бадай, я хутка цябе паслухаю.

У калідоры былі развешаны карціны Жарнасека, чыім талентам я не перастаю захапляцца. Ён — лепельскі Пірасмані, які да канца свайго нялёгкага жыцця захаваў наіўны і дзіцячы погляд на свет. Яго прымітыў — гэта чароўныя лебедзі на чароўных лясных азёрах.

— Рая, вось бы нам зрабіць каталог работ Жарнасека! На айчынным паліграфічным абсталяванні альбом еўрапейскага ўзроўню не зробіш, трэба заказваць у Аўстрыі або ў Славеніі, а для гэтага патрэбны грошы.

— Колькі?

— Тысяч дваццаць еўра за найменшы тыраж.

— Адкуль браць такія грошы? У нас культура фінансуецца па астатачным прынцыпе — з таго, што застаецца пасля асноўных артыкулаў расходу. І звычайна нічога не застаецца...

— Вось калі мы пачнём фінансаваць культуру і адукацыю ў першую чаргу, тады можам лічыць сябе культурнай краінай.

Мы развіталіся, і я вярнуўся ў пансіянат. Там мяне чакаў збянтэжаны Дзіма.

— Прабачце, не дагледзеў. Алесь прыснуў, а я літаральна на пяць хвілін спусціўся ў хол. За гэты час ён выпіў паўбутэлькі гарэлкі і глечык медавухі. Зараз спіць п'яны.

— Што ж, дарога да зорак бывае нялёгкай. Канешне, можна зараз і разбегчыся, але можна і пазмагацца. Што выберам?

— Дарогу да зорак!

— Згодзен! Тады сачы, каб Алесь больш нічога не піў, а я адлучуся гадзіны на тры. Калі не захацеў лячыцца па-царску, будзе па-татарску.

Я зайшоў у краму, купіў шакаладных цукерак, пакунак белага кітайскага чаю «Мао Фенг» і вязанку абаранкаў. Затым паехаў у бок вайсковага палігона. Пачало змяркацца. Я праехаў кіламетраў дзесяць, мінуў дзве пустыя вёскі, нежылыя дамы якіх разбітымі акулярамі вокнаў сумна глядзелі на свет, абагнуў возера, даехаў да ледзь прыкметнай сцяжынкі і заглушыў матор. Далей дарогі не было. Я захапіў падарункі, запаліў ліхтарык і асцярожна рушыў наперад. Сцяжынку пераразаў ручай. У кустах я знайшоў кладку і па ёй перайшоў цераз яго. Яшчэ праз сотні дзве метраў сярод магутных ліп стаяла хаціна. Прыгледзеўшыся, можна было заўважыць, што да яе не цягнуліся электрычныя правады. Загаўкаў сабака. Калі я падышоў да ганка, дзверы адчыніліся і бабуля сказала: «Добры вечар, Зміцер! Заходзь, я цябе чакаю». Я павітаўся, прайшоў цёмны трысцен і трапіў у даволі вялікі пакой, які асвячаўся газніцай.

— Бабуля Зося, можа, дапамагчы табе правесці сюды электрычнасць?

— Навошта? Людзі амаль тры тысячагоддзі цудоўна абыходзіліся без электрычнасці, а зараз, калі вас, гарадскіх жыхароў, пакінуць без яе, вы праз тры дні вымраце, як маманты.

— Можа і так. Вось табе гасцінцы, бабуля.

— Дзякуй, толькі я для цябе хутчэй няня, а твая сапраўдная бабуля была маім Майстрам і Настаўнікам.

— Зараз ты сама Майстар.

— Так, але да ўзроўню тваёй бабулі мне яшчэ расці і расці... Хаця часу для росту засталося не так многа.

— Гэтага ніхто не ведае...

— Я ведаю. Кожны Майстар павінен ведаць час сваёй смерці, каб да гэтага дня падрыхтаваць сабе пераемніка, інакш таемныя веды знікнуць. Расказвай, з чым прыйшоў, хаця я і сама здагадваюся.

— Хачу выратаваць свайго сябра Алеся ад гарэлкі. Загібаецца хлопец.

— Зміцер, справа гэта нялёгкая. Ён зараз на такой стадыі залежнасці, што лячыць яго травамі трэба год, але ты хочаш хутка... Тут ёсць адзіны сродак — яд з калючак вожыка. Майстар мае права прыгатаваць яго толькі раз у жыцці. Трэба знайсці вожыка і ўгаварыць яго аддаць жыццё для выратавання чалавека. Перад смерцю звярок плача, і яго слёзы, змешаныя з вадкасцю з калючак, утвараюць яд. Вельмі моцны. Ад яго чалавек альбо памірае, альбо назаўсёды губляе цягу да гарэлкі. Ты чуў, як плача вожык?

— Не.

— Лепш не чуць... Я аднойчы зрабіла гэты адварот для свайго адзінага сына. У яго не вытрымала сэрца... Цяпер я кожны дзень хаджу на яго магілу і прашу прабачэнне, хаця ведаю, што ён мне даўно дараваў, бо тое існаванне, якое ён вёў, нельга назваць жыццём. У мяне засталіся гэтыя лекі. Ты возьмеш на сябе адказнасць за жыццё сябра?

— Вазьму!

Бабуля дастала з паліцы маленькую бутэлечку і падала мне.

— Вылі гэтую вадкасць у бутэльку з півам і пастарайся, каб сябар яе выпіў. Яго будзе ванітаваць так, што сярэдневяковыя катаванні здаліся б яму асалодай. Калі выжыве, праз суткі прыедзь да мяне.

— Добра, дзякуй.

— Дарэчы, ты ведаеш, што бабуля ў дзяцінстве перадала табе веды Майстра? Трэба толькі правесці абрад пасвячэння, каб адкрыць тое, што захоўваецца ў табе, як у шкатулцы са скарбам, ад якой згубілі ключ. Ты абавязкова прыйдзеш да мяне, проста яшчэ не прыйшоў час... Бывай!

Я на другой передачы цягнуўся па ледзь бачнай дарозе. Фары выхаплівалі з цемры фрагменты сумнага восеньскага пейзажу, якія стваралі агульнае палатно пад назвай «Падрыхтоўка прыроды да зімы». Нарэшце выехаў на шашу і прыбавіў

газу. У Лепелі купіў у краме бутэльку «Аліварыі». У машыне асцярожна адкаркаваў яе, выліў туды рэшткі настою з бутэлечкі і зноў акуратна закрыў пробку. У нумары Дзіма глядзеў нейкі баявік, а Алесь ляжаў тварам да сцяны і рабіў выгляд, што спіць. Яму было сорамна і не хацелася ні з кім размаўляць. Я адкрыў халадзільнік і гучна, каб пачуў сябар, паставіў туды бутэльку піва.

— Дзіма, пойдзем павячэраем, пакуль Алесь спіць, — прапанаваў я.

Мы спусціліся ў рэстаран і нетаропка павячэралі. Калі вярнуліся ў нумар, то ўбачылі пустую бутэльку з-пад «Аліварыі» і з прыбіральні пачулі стогны і плач Алеся. Ён стаяў на каленях ля ўнітаза, яго цела раз-пораз ахоплівалі канвульсіі, і яго ванітавала. Ды ванітаваць ужо не было чым…

— Хлопцы, — усхліпваючы, прашаптаў ён, — у мяне ў кішках сядзіць вожык. Ён плача, колецца і хоча вылезці на волю. Разрэшце мне жывот і выпусціце яго. Прашу вас, дапамажыце!!!

Я спалохаўся. Дзіма таксама.

— Я выклічу «Хуткую дапамогу»! — прапанаваў ён.

— Яны не дапамогуць. У народнай медыцыны і афіцыйнай розныя сродкі лячэння.

Жэстам я паклікаў Дзіму ў калідор.

— Пачалі дзейнічаць лекі. Трэба чакаць суткі.

— Але ён можа не вытрымаць. Як яму дапамагчы?

— Я ўзяў на сябе адказнасць, але мне самому страшна… Пачакаем хаця б гадзіны дзве, каб у Алеся выпрацаваўся адмоўны рэфлекс на алкаголь, інакш ён заўтра зноў можа сарвацца.

— Я не магу слухаць яго стогны — сэрца разрываецца…

— Ідзі ў хол, а роўна праз дзве гадзіны вернешся.

Гэтыя дзве гадзіны, якія я назіраў за мукамі сябра, падаліся мне вечнасцю. У яго ўжо не хапала сіл трымацца за ўнітаз, ён споўз на падлогу і ляжаў там у позе эмбрыёна. Вельмі хворага эмбрыёна. Нарэшце прыйшоў Дзіма. Мы падхапілі Алеся пад пахі, абмылі яму твар вадой і паклалі ў ложак. Я сеў побач, па-

клаў рукі на галаву сябра, заплюшчыў вочы, і з мяне паліліся словы, якіх я раней не ведаў:

Духі анёлаў: Зафкіель, Цадкіель,
Самаель, Міхаель, Ханіель, Рафаель,
Габрыель; прыміце чатыры стыхіі:
Зямлю, Ваду, Агонь і Паветра.
Высушыце смагу піцця
Усялякага зелля і віна
У раба Божага Алеся. Амінь.
Вазьміце келіх на крылы свае,
Вазьміце закляцце на смагу віна.
Заклінаю і патрабую
Імем бога Маісея,
Бога Аўраама,
Бога Іакава:
Ачысціце яго цела
Ад згубнай звычкі віна.
Накладзіце сваю пячатку
На маю просьбу і на маю працу.
Пашліце яму адпачынак
У імя Бога жывога.
Амінь!

І Алесь заснуў.

Раніцай я зноў накіраваўся да бабулі Зосі. З-за хмар раз-пораз выглядвала скупое восеньскае сонейка, ажыўляючы сумны кастрычніцкі пейзаж. Рунь на фоне леса здавалася Уімблдонскім полем, на якое вось-вось выйдуць Роджэр Федэрэр і Рафаэль Надаль, але адзінымі «тэнесістамі» зараз былі зайцы, якія ласаваліся сакавітымі парасткамі. На ўзлеску я заўважыў малады дуб, барвовае лісце якога каштоўнымі рубінамі рдзела на сонейку. Я заглушыў матор і падышоў да дрэўца. Дуб — сакральнае дрэва беларусаў. Ён волат нашых лясоў, пазней за ўсіх скідвае лісце і даўжэй за ўсіх прачынаецца пасля зімовага сну. А яшчэ ён лечыць. Я разуўся, скінуў шкарпэткі, куртку, кашулю, абняў дрэва, стаўшы тварам на ўсход, счапіў рукі ў за-

мок, прыціснуўся шчакой да шурпатага ствала, заплюшчыў вочы і прашаптаў:

— Дуд-дубочак,
Валадар лясоў,
Дай мне тваю сілу, спакой і мудрасць.
Будзь мне ахоўнікам ад злой сілы!

І хоць пад восеньскім ветрам маё цела спачатку пакрылася гусінай скурай, я адчуў цяпло, якое ішло ад магутнага дрэва. Добра. Цяпер я гатовы дзейнічаць далей. Я пацалаваў дрэва, апрануўся і рушыў да аўтамабіля.

Бабуля Зося мяне чакала:

— Ты ўсё зрабіў правільна, Зміцер! — пахваліла яна мяне. — Пакрысе ў цябе актывізуюцца схаваныя веды. Завары вось гэтыя зёлкі і дай твайму сябру шклянку адвару з мёдам. Ён праспіць суткі, і за тры дні прыйдзе ў норму. Алкаголь ён ужываць больш не будзе.

— Дзякуй, Майстар! — я абняў і пацалаваў бабулю Зосю.

— Не забывай старую, ты зараз у мяне замест сына...

Вярнуўшыся, я выканаў загад бабулі. Алесь прачнуўся, выпіў адвар і зноў заснуў.

— Дзіма, да змяркання яшчэ гадзіны чатыры. Можа, парыбачым?

— Я не супраць, але ж у нас няма ні вудачак, ні рыбацкай вопраткі...

— Знойдзем!

Я дастаў мабільнік і знайшоў тэлефон дзядзькі Васіля. Ён адазваўся даволі хутка:

— Прывітанне, Зміцер! Адкуль тэлефануеш?

— Прывітанне, дзядзька Васіль! Ды я ў вашых мясцінах. Ці можам мы сёння з'ездзіць на шчупакоў?

— Хоць на шчупакоў, хоць на дыназаўраў! Ты што, не помніш, дзе я жыву? Прыязджай!

Праз чвэрць гадзіны мы ўжо адчынялі веснічкі хаты дзядзькі Васіля. Ён не хаваў сваёй радасці.

— Нарэшце ўспомніў пра старога! А то мне ўжо хутка прыйдзецца пераплыць тую рэчку, з-за якой не вяртаюцца... Рыбу ў ёй, пэўна, не ловяць. Дарэчы, як яна называецца?

— Сцікс. Але мы з табой парыбачым яшчэ на гэтым свеце. Ты нам з сябрам вопратку знойдзеш?

— Пайшлі, падбяром вам гардэробчык.

Вайсковая форма колеру хакі, бушлаты, гумавыя боты, вязаныя шапкі надалі нам выгляд сапраўдных рыбакоў. Праз пяць мінут мы сядзелі ў лодцы дзядзькі Васіля.

— Мальцы, вось вам па спінінгу. Лавіць будзем на мае самаробныя блешні. Моладзь зараз часцяком ловіць на воблер, але мае самапалкі не горшыя. Зараз рыба рыхтуецца да зімоўкі, збіраецца на глыбокія яміны, дзе яе і хапае шчупак. Таму лавіць будзем на глыбіні. Адзін з вас сядзе на левую частку кармы, другі — на правую. Паехалі!

Дзядзька Васіль запусціў матор сваёй «Ямахі», і мы паімчалі. Маторку пагойдвала на хвалях, вецер кідаў у твар пенныя пырскі, і ўсё гэта стварала непаўторнае для кожнага мужчыны пачуццё прадчування хуткай здабычы, якое прымушала біцца ў паскораным тэмпе сэрца і пячорнага чалавека, і сучаснага інтэлігента. Я закінуў блешню метраў на трыццаць, даў ёй апусціцца метры на тры-чатыры, і канцом вудзільна пачаў мяняць вугал праходжання, ствараючы імітацыю паводзін невялікай рыбіны, напалоханай драпежнікам. Дзіма рабіў тое ж самае. Не прайшло і дзесяці мінут, як у мяне «цюкнула». Дзеля страхоўкі я зрабіў падсечку, паставіў катушку на тормаз і пачаў намотваць лёску. Па сапраціўленні здавалася, што рыбіна вялікая, але, калі я падвёў яе да лодкі, аказалася, што гэта акунь грамаў на трыста. Не «гарбач», але і не «матрос». Дзіма хутка выцягнуў кілаграмовага шчупака, і яго твар ажно засвяціўся ад радасці.

Дзядзька Васіль змяніў курс і ўзяў накірунак на востраў. Хутка я адчуў моцны ўдар, і з цяжкасцю пачаў выводзіць ры-

біну, якая аказвала шалёнае супраціўленне. Гэта быў вельмі прыстойны судак. Я так спяшаўся дастаць яго з вады без сачка, што параніў сабе руку аб калючы спінны плаўнік. Пакуль я смактаў палец, спрабуючы спыніць кроў, Дзіма адчуў такі ўдар, які ледзь не выбіў спінінг з ягоных рук. Дзядзька Васіль заглушыў матор і пачаў назіраць за паядынкам, гатовы прыйсці на дапамогу. Я таксама зматаў лёску. Дзіма спрабаваў падняць рыбіну на паверхню, але яна ўпарта ішла на глыбіню. Змаганне доўжылася ўжо чвэрць гадзіны. Здавалася, рыбіна стамілася, і Дзіма пакрысе пачаў падматваць лёску. Раптам лёска правісла. Я заўважыў, як нешта падобнае на тарпеду пачало імкліва набліжацца да лодкі. Дзядзька Васіль перахрысціўся, імгненна запусціў матор, крыкнуў Дзіму: «Рэж лёску!» — і пачаў уцякаць. За лодкай гналася нейкая вялізная раз'юшаная істота. Дзіма адной рукой трымаў спінінг, а другой спрабаваў дастаць з кішэні нож. «Кідай спінінг за борт, хлопча»! — крыкнуў дзядзька Васіль. Дзіма не паспеў выканаць яго загад, таму што з вады выскачыла нейкае стварэнне, падобнае на кракадзіла даўжынёй метраў у пяць, зрабіла кульбіт у паветры і плюхнулася ў ваду з шумам Ніагарскага вадаспада. Ціўкнула парваная лёска, і Дзіма са збялелым тварам застаўся сядзець у поўнай прастрацыі. Рукі яго калаціліся. Дзядзька Васіль на максімальных абаротах нёсся да берага. Калі мы прышварталіся, ён сеўшым голасам выдыхнуў:

— Ну, можа, цяпер мне паверацьЮ а то «брахун ды брахун»!

— А ты што, ужо сустракаўся раней з гэтай пачварай?

— Тут без чаркі не раскажаш... Пойдзем да мяне!

Пасля смерці жонкі дзядзька Васіль жыў адзін з катом ды сабакам. Яго роднай хатай было возера, на якім ён, здавалася, ведаў кожную затоку і водмель. Парыбачыць да яго прыязджалі і міністры, і сябры-пенсіянеры, і ніхто не заставаўся без улову. У дзядзькі было пасведчанне інспектара рыбнагляду, і з браканьерамі ён змагаўся, неаднойчы рызыкуючы

жыццём. Гадоў пяць назад я выручыў адчайнага інспектара, калі на яго навaліліся тры бугаі, у якіх ён канфіскаваў электрычную вуду. З тае пары мы сябруем.

У хаце адчуваўся недахоп жаночай рукі, але адносную чысціню і парадак дзядзька Васіль падтрымліваў. Ён прынёс з кладоўкі кавалак сала і слоік з гуркамі, з халадзільніка дастаў бутэльку гарэлкі і талерку са смажанымі «ножыкамі» (так завуць у нас невялікіх шчупакоў). Наліў па чарцы сабе і Дзіму.

— Табе трэба выпіць, малец, каб супакоіцца. Зміцер, твая кава вунь на той палічцы.

— Я не ведаў, што адрэналін на Лепельшчыне можна чэрпаць салдацкімі кубкамі, — сказаў Дзіма.

— Можна нават вёдрамі, — дадаў я.

— А можна і лодкамі. Ну, мальцы, за запаведныя мясціны нашай радзімы! — падсумаваў дзядзька Васіль і зухавата кульнуў чарку гарэлкі.

Дзіма не адстаў. Дзядзька з’еў кавалак сала з хлебам, сказаў Дзіму: «Камшы, салдацік, бо лепшая рыба — сала!» — і пачаў аповед:

— На гэтым возеры я нарадзіўся, на ім і памру... Яшчэ бацька мне расказваў пра нейкую таямнічую істоту, якая хапае качак, гусей і нават дзяцей. Я гэтаму не верыў. Але аднойчы, калі рыбачыў ля вострава, непадалёку ад таго месца, дзе сёння схапіў блешню твой, Дзіма, «шчупачок», сам убачыў, як з-пад вады высунулася вялізная галава нейкай пачвары і схапіла лебедзя, які мірна плаваў тут. Лебедзь — птушка не маленькая, але ён знік у страшэннай пашчы, нібы сасіска ў роце ваўкадава. Бедная птушка нават ціўкнуць не паспела. Калі я расказваў пра гэтае здарэнне сябрам, з мяне толькі пасмейваліся і пыталіся, колькі я выпіў перад рыбалкай. Але прафесар з Мінска, які прыязджаў да мяне, сказаў, што ў адным са старажытных летапісаў згадваецца аб вялізным змеі або цмоку, цела якога ў XII стагоддзі знайшлі на беразе Лепельскага возера. Магчыма, гэта быў іхтыязаўр.

Паводле адной з гіпотэз, на востраве ёсць падводныя пячоры, дзе магла захавацца папуляцыя дыназаўраў. Лепельскае возера ўваходзіла ў склад Бярэзінскай воднай сістэмы, якая злучала басейны Балтыйскага і Чорнага мораў, таму прыплыць да нас магла любая істота.

— А можа, лепельская пачвара хутка заткне за пояс лахнэскую? — запытаўся Дзіма.

— Не трэба аніякага ажыятажу. У прыроды павінны заставацца свае таямніцы. Таму давайце дамовімся: пра сённяшні выпадак — нікому ні слова! — сказаў я.

— Згодзен з табой, — падтрымаў мяне дзядзька.

Мы пасядзелі яшчэ з гадзіну і развіталіся. Я аднёс рыбу на кухню рэстарана і папрасіў прыгатаваць на сняданак фаршыраванага шчупака, а судака падсмажыць у дарогу. У нумары Алесь спаў, зрэдку ўсхліпваючы і даючы храпака. Я адчыніў фортку, бо пах у нумары стаяў бамжацкі. Мы пераапрануліся і спусціліся ў рэстаран павячэраць. Я заказаў свае любімыя дранікі са смятанай, а Дзіма клёцкі з душамі.

— Бульбашы мы з табой, Дзіма, — сказаў я, — і нікуды ад гэтага не дзецца.

— Першымі бульбашамі былі амерыканскія індзейцы. Цікава, ці вырошчваюць яны зараз бульбу?

— Думаю, што не. Яны паказваюць шоу для іншаземцаў і здымаюцца ў прыгодніцкіх фільмах, а бульбу вырошчваюць амерыканскія фермеры, колькасць якіх складае ўсяго тры адсоткі ад ліку амерыканцаў. І кормяць яны палову свету.

— Вось толькі жука яны нам падкінулі.

— Каларадскага?

— Так. Самі, пэўна, пра яго ўжо забыліся. Няхай бы ён вярнуўся на гістарычную радзіму.

— Ты што, Дзіма! Як жа нашы дачнікі без жука? Ім жа трэба накупіць «Каратэ» і зліваць гэтым ядам кожную расліну па тры разы на сезон, а потым есці атручаныя клубні і здзіўляцца, чаму выпадаюць зубы і валасы. Без жука мы не

можам, ён стаў нашай нацыянальнай істотай. Добра, сынку, на сёння прыгод дастаткова. Пойдзем спаць.

Ранкам мяне разбудзіў бадзёры голас, які ў ванным пакоі напяваў «Мішку касалапага». Я прыслухаўся. Дык гэта ж Алесь! Дзверы адчыніліся, і ў банным ручніку вакол торса ўвайшоў мой сябра. Але гэта ўжо быў не ўчарашні напаўмёртвы Алесь, а паголены імпазантны мужчына з усмешкай на загарэлым твары.

— Уставайце, соні! — крыкнуў ён. — Досыць дрыхнуць!

— Як ты?

— Цудоўна, быццам нанова на свет нарадзіўся! Вось толькі есці вельмі хочацца.

— Што і не дзіўна! Праз твой страўнік зараз можна назіраць за сонцам. А можа, не будзем яго засмечваць рознай ежай?

— Будзем! Абавязкова будзем, бо, калі мой страўнік выпусціць на волю, ён нават траву будзе скубці ад голаду!

— А ад рыбы з Лепельскага возера ён не адмовіцца?

— Не здзеквайся, а то слінай захлынуся!

— Добра, тады будзім Дзіму і на сняданак.

У рэстаране нам прынеслі вялізнае блюда з фаршыраваным шчупаком, да якога я заказаў чыгунок сопкай бульбачкі, масліны і, вядома ж, хрэн. Заліўная рыба без хрэну што скварка без чаркі.

— Дзядзька Алесь, гэта мой учарашні трафей! — з гонарам зазначыў Дзіма, паказваючы на шчупака.

— Хвацкі драпежнік! Дык вы без мяне рыбачылі, вось гэта сябры...

— Ты даваў такога храпака, што фіранкі ў нумары паказвалі шторм у сем балаў. У мяне не хапіла нахабства перарваць гэткі сон, таму — прабач... Давай лепш зацэнім якасць прыгатавання.

Я паклаў сябрам і сабе рыбу, адрэзаў кавалачак, намазаў хрэнам і адправіў у рот. Спачатку хрэн лапай злой рысі дзербануў паднябенне, прабіў слязу, а потым, уступіўшы

ў саюзныя адносіны са шчупаком, расквеціў яго смак новымі гарманічнымі адценнямі. Цяпер маслінку і гарачую бульбінку. Хлеба не трэба. Хлеба я і дома паем. Сма-ка-та! Мяса шчупака такога памеру сухаватае, але ў фаршыраваным выглядзе — самае то! Як там сябры? Алесь трушчыў ужо трэці кавалак і аж стагнаў ад задавальнення. Дзімка не адставаў. Праз чвэрць гадзіны толькі галава шчупака сумавала на пустой талерцы.

— Малайцы, габрэі! — дажаваўшы апошні кавалак, выдаў Алесь. — Такую страву прыдумалі!

— Часу ж хапала, за пяць тысячагоддзяў можна нешта і прыдумаць, — выказаўся я. — Зараз мы з Дзімам вып’ем па кубачку кавы, а табе — кісель з журавін і дзве таблеткі «Фестала». Потым у дарогу. Спачатку заедзем за тваёй басухай — і на Полацк!



# Падарожжа трэцяе. Ігар



Ад Лепеля да Полацка рукой падаць. Алесь пасля сытнага сняданка драмаў на заднім сядзенні, Дзіма па плэеры слухаў музыку, а я зноў уключыў адваротную перамотку ўспамінаў. Ігар, да якога мы ехалі, іграў на іоніцы. Ён быў на год маладзейшым за нас, маленькага росту, меў пузік і падпольную мянушку Алег Папоў, бо быў вельмі падобны на знакамітага тады клоўна. Да таго ж меў нядрэнныя артыстычныя здольнасці. Яго бацька, падпалкоўнік-ракетчык спартыўнага выгляду, служыў у Германіі і, здавалася, саромеўся свайго няўклюднага сына, якога сплавіў на выхаванне да бабулі. Старая любіла адзінага ўнука і дазваляла яму рабіць што заўгодна. Яе старэнькая двухпакаёўка была месцам нашых сустрэч і застолляў. Пасля адлічэння з універа Ігар трапіў на службу ва ўнутраныя войскі. Чырвонапагоннікаў нідзе не любяць. Да таго ж беднага хлопца накіравалі ў вайсковую частку, якая ахоўвала асуджаных на пазбаўленне волі. Аднойчы трое зэкаў напалі на пост аховы, забілі аднаго з салдат і забралі аўтамат з камплектам боепрыпасаў. Дваіх палажылі з вышкі, а трэцяму ўдалося збегчы. Байцоў кінулі ў ачапленне. Ігар сядзеў у засадзе. На яго і выскачыў зэк. Яны адначасова ўскінулі аўтаматы. Ігар стрэліў на імгненне раней. У якасці ўзнагароды яго адпусцілі на тыдзень дадому. Мы сабраліся ў рэстаране «Нёман». Ігар спачатку харахорыўся, але пасля трэцяй чаркі размяк і заплакаў.

— Хлопцы, я забіў чалавека! Як гэта пераджыць? — усхліпваў ён, зноў ператварыўшыся ў маленькага хлопчыка, якому за гэты час не было магчымасці выплакацца на чыім-небудзь плячы. Мы, як маглі, суцяшалі сябра, казалі, што калі б не ён, то яго, але той стрэл пакінуў незагойную рану ў тонкай душы Ігара...

Пасля службы ў войску ён паступіў у «кулёк» (універсітэт культуры) на факультэт арганізацыі відовішчных мерапрыемстваў і пасля таго знік з майго поля зроку. Як ён аказаўся ў Полацку?

Раздумваючы над гэтым пытаннем, я даехаў да горада, уключыў навігатар і знайшоў патрэбную вуліцу. Шэры пяціпавярховы будынак на фоне шэрага неба. Пафарбаваць бы яго ў ружовы колер, можа, у жыхароў было б меней восеньскіх стрэсаў...

— Сябры, выходзім, прыехалі! Як паспаў, Алесь?

— Цудоўна! Змарыў мяне фаршыраваны шчупак. Мой страўнік, Дзіма, перадае табе словы шчырай падзякі за незабыўны кайф.

— І ад мяне прывітанне вашаму гераічнаму страўніку, дзядзька Алесь!

— Чаму гераічнаму?

— Таму што за апошнія гады ты правёў над ім эксперыментаў не менш, чым доктар Менгеле над вязнямі канцлагера, — адказаў я.

— Што праўда, то праўда, — уздыхнуў Алесь.

Мы зайшлі ў другі пад'езд, падняліся на трэці паверх, кватэра 58. Я націснуў на кнопку званка. Цішыня. Яшчэ тры доўгія званкі. Нарэшце пачулася шарканне тапак па падлозе, дзверы адчыніліся, і ў нас утаропілася рожа нязголенага суб'екта ў трусах і майцы, выгляд якога яўна гаварыў аб тым, як добра яму было ўчора і як дрэнна сёння.

— Што трэба? — прасіпеў ён.

— Добры дзень! — прывітаўся я. — Цябе ў школе ветлівасці вучылі? Ці этап выхавання не ўвайшоў у склад тваёй біяграфіі? Ігар дома?

— А пайшлі вы на… .

Не паспеў ён вылаяцца, як я схапіў яго за руку і рвануў на сябе. Праз хвіліну Алесь і Дзіма надзейна трымалі аматара ненарматыўнай лексікі ў сваіх дужых руках. Не даўшы апамятацца, я наском чаравіка паволі сцягнуў з яго трусы. Нахабнік, страціўшы ваяўнічы запал, спалохана глядзеў то на нас, то на свой брудны аксесуар бялізны.

— Ты рэкламу «Тайда» бачыў? Дык вось мы прыйшлі да цябе. Будзеш рыпацца — выкінем на вуліцу без бялізны. Будзеш весці сябе культурна і ветліва — памыем у ванне разам з тваёй бялізнай. І нават півам пачастуем. Ферштэйн?

— Я, я, — прамармытаў ён.

— Бач ты, па-нямецку загаварыў, паліглот полацкі, — сказаў Алесь. — Можа, табе, Зміцер, запатэнтаваць новую стрэсавую методу навучання іншаземным мовам?

— Я падумаю, братан, над тваёй прапановай. Дзе Ігар? — звярнуўся я да затрыманага.

— Ды ў дурцы ён… Жонка здала.

— Атака ззаду! — крыкнуў Дзіма.

Я інстынктыўна бразнуўся на цэментную падлогу і закрыў галаву рукамі. Праз мяне з віскатам пераляцела нейкая кудлатая істота, спатыкнуўшыся, выпусціла патэльню, якой, пэўна, хацела мяне атаварыць, бразнулася на калені і для раўнавагі ўчапілася рукамі ў кублы свайго знаёмца. Відовішча магло б быць вельмі эратычным, калі б выканаўцы былі ў лепшай фізічнай форме.

— Зміцер, — сказаў Алесь, — хопіць валяцца на брудным цэменце, лепш зрабі фотаздымак. «Плэйбой» заплаціць добрыя грошы.

— Яны яшчэ не зрабілі варыянта часопіса для дэкласаваных элементаў, — адказаў я, падымаючыся з падлогі.

— Хопіць здзекавацца, «Мішкі» сраныя, — уступіла ў размову кудлатае стварэнне. — Вас саміх за п'янку выперлі з універа. Няўжо вы так паразумнелі за дваццаць гадоў, што кінулі піць? Нешта не верыцца...

Нічога сабе! Яна нас ведае?

— Назаві сябе, чароўнае стварэнне, — папрасіў я.

— Стэла я, з групы Ігара, — адказала жанчына, — з-за цябе, казла, толькі калені пазбівала.

— За казла адкажаш, ластаўка мая. Пойдзем у кватэру, пагутарым.

— Я вас на госці не запрашала.

— А мы самі прыпёрліся. Пойдзем. Каралеўскага прыёму мы ад цябе не чакаем, але пагутарыць трэба.

— Чорт з вамі. Заходзьце. Толькі Вадзіка адпусціце.

— Ты б яму хоць бялізну памыла.

— Пераб'ецца, у мяне самаабслугоўванне. Праходзьце на кухню, я апрануся.

У двух пакоях і на кухні кватэры, куды мы зайшлі, як кажуць, конь не валяўся. Пачуўся стук дзвярэй і імклівыя крокі па лесвіцы. Гэта Вадзік, не дачакаўшыся абяцанага піва і памыўкі ў ванне, даў дзёру. Хай сабе, здаравей будзе.

— Алесь, ты ўспомніў гэтую Стэлу?

— Успомніў, але не пазнаў.

— У яе ж быў закаханы Ігар, чытаў вершы Блока і Мандэльштама. Казаў, што яна такая ўзнёслая, так яго разумее...

— Зміцер, уся паэзія заканчваецца за дзвярыма загса. Потым ад мужа патрабуюцца грошы і праца па хатняй гаспадарцы: мужык гатуе ежу, прыбірае кватэру і нават мые бялізну. А для сексу яны знаходзяць вось такіх вадзікаў.

— Адкуль вы гэта ведаеце, дзядзька Алесь? — засмяяўся Дзіма.

— З горкага вопыту, сынок. Эх, Розы, Клары і эмансіпацыя давялі славянскіх мужыкоў да стану рабоў. Выхаванню жанчын трэба вучыцца ў мусульман. Калі б мне скінуць дзясятак гадоў ды знайсці трыццаць тысяч долараў, я б купіў сабе ў Егіпце жон-

ку. Яна б рабіла ўсю хатнюю працу, вечарам паказвала мне танец жывата, а я сядзеў бы на беразе Чырвонага мора, паліў кальян з гашышам і, як Аладзін, лётаў на дыване-самалёце...

— Зваліўся, Рашыд лепельскі, — голас Стэлы груба абарваў летуценныя мары Алеся.

Яна за дзесяць хвілін паспела прывесці сябе ў адносна належны выгляд, нават нейкі макіяж зрабіла, але маршчыны на твары, патухлыя вочы і лёгкі трэмар рук былі няўмольнымі сведкамі пэўнай стадыі алкагольнай залежнасці.

— Што з Ігарам? — запытаўся я.

Стэла запаліла цыгарэту і загаварыла рэзка і нервова, глытаючы канчаткі слоў і зрываючыся на крык:

— Ты, самазадаволены бізнесмен, успомніў пра Ігара?! А дзе ты быў раней? Калі вы разам гралі ў гурце і пілі «чарніла», усё было цудоўна, а потым, калі пачаліся жыццёвыя складанасці, кожны з «Мішак» схаваўся ва ўласнай бярлозе і пачаў сматкаць лапу. Ды толькі не ў кожнага было што смактаць... Вы ведалі, што бацькі Ігара загінулі ў аўтааварыі, што памерла яго бабуля? Што ваш аднакурснік Юрка (каб ён здох!), які працаваў загадчыкам адміністрацыі парку Чалюскінцаў, уцягнуў Ігара ў аферу з правядзеннем «левых» канцэртаў і латарэй, за што абодва трапілі за краты? Што Ігару, каб разлічыцца з даўгамі, прыйшлося прадаць бабуліну кватэру? Хто-небудзь з вас яму дапамог?

Я, апусціўшы галаву, слухаў словы гнеўнай водпаведзі, і кожнае перуновай маланкай біла прама ў сэрца. Таму што было праўдай... Праўдай злой і няўмольнай.

— Як вы аказаліся ў Полацку? — спытаў Алесь.

— За аднапакаёўку, якая дасталася Ігару пасля смерці бацькоў, мы выменялі двухпакаёўку ў Полацку, таму што тут знайшлася праца для Ігара. Але турма яго зламала... Вы ведаеце, што робяць зэкі з былымі чырвонапагоннікамі? Яшчэ ў Мінску Ігар ляжаў на Бехцерава, потым у Навінках. І вось у Полацку ён ужо другі раз трапляе ў дурку.

— А ты ў гэты час п'еш гарэлку і трахаешся з Вадзікам, аматарка Мандэльштама.

> Дано мне тело — что мне делать с ним,
> Таким единым и таким моим?
> За радость тихую дышать и жить
> Кого, скажите, мне благодарить?

Дык ты вырашыла, Стэла: цела ў дзела, а мужа ў псіхушку?

Відаць, я перагнуў палку атрутнага красамоўства, бо Стэла схапіла пустую бутэльку і замахнулася, збіраючыся праверыць моц майго чэрапа. Дзіма паспеў выхапіць гэты самы переканаўчы аргумент хатніх сварак з яе рукі, а Алесь схапіў фурыю за плечы і не вельмі далікатна пасадзіў на стул.

— Вон з маёй кватэры! — крычала яна, у адно імгненне зноўператварыўшыся ў дзікую кошку.

— Мы пойдзем, але заўтра вернемся з Ігарам, а ты пойдзеш на яго месца! — завяршыў я нашу «далікатную» размову.

Пад праклёны і лаянку Стэлы мы выйшлі з кватэры.

— Не ўмееш ты, сябра, весці дыпламатычны перамовы, — уздыхнуў Алесь.

— Дыпламатыі я вучыўся ў галоўнага героя «Пятага элемента», а ён да трох ніколі не лічыў. Аб чым з ёй размаўляць? Калі жонка замест таго, каб дапамагчы мужу, здае яго ў псіхушку, значыць, ён ёй больш не патрэбны. Ведаеце, сябры, самае крыўднае тое, што мы з вамі занадта гордыя і лічым за лепшае загнуцца, чым патрывожыць былых сяброў... А Ігару мы дапаможам!

— Кроў з носу! — падсумаваў Дзіма.

Я дастаў мабільнік, даведаўся тэлефон псіхіятрычнай бальніцы і пазваніў у рэгістратуру.

— Ігар зараз на прагулцы. Едзем?

— Едзем!

Праз пятнаццаць хвілін мы былі на месцы. Свабодна прайшлі праз турнікет. Пажылы ахоўнік у шкляной будцы піў гарбату, еў бутэр з доктарскай і толькі акінуў нас лянівым позіркам.

Яму не хацелася пакідаць свой маленькі цёплы рай і выходзіць у золкую восень. Між шэрых карпусоў дажываў свой век запушчаны парк. У канцы алеі я заўважыў калону людзей, якія паволі набліжаліся да нас. Яны ішлі як палонныя немцы. Але чаму немцы? Палонныя любых нацыянальнасцей ходзяць аднолькава. Прыніжана і забіта. А гэтыя людзі не вытрымалі змагання з жыццёвымі складанасцямі. Патушаныя антыдэпрэсантамі, апранутыя ў шэрыя фуфайкі, яны, апусціўшы галовы, бязвольна шаркалі падэшвамі па мокрым асфальце. Малады хлопец, рукі якога паторгваліся, як у зламанай завадной лялькі, спрабаваў паглядзець уверх, але тут жа вінавата апускаў галаву ўніз. Падбілі, гады, падбілі!

Ігара я пазнаў не адразу. Ён ішоў трэцім. Куды дзяваўся яго пузік і пухлыя ружовыя шчокі? На галаве была зімовая салдацкая шапка, на якой нават штучны мех пад адарванай зорачкай паспеў выцвісці, на шыі матляўся брудны шалік, а растаптаны абутак, які на Віцебшчыне завуць «срайходамі», быў годны хіба на тое, каб хадзіць у хлеў. Хворыя падышлі бліжэй , але не звярнулі на нас аніякай увагі. Я аклікнуў:

— Ігар!

Ён паволі павярнуў галаву. Ніякіх эмоцый, ніякага водгуку. Я падбег і абняў старога сябра. Ніякіх рухаў у адказ, хаця я бачыў, што ён мяне пазнаў. Раптам нехта бесцырымонна рвануў мяне за плячо. Я абярнуўся. Стокілаграмовы санітар нахабна глядзеў у вочы, і яго гнілое дыханне гаварыла аб тым, што на рэкламе «Blend-a-med» увагі ён не засяроджваў. Санітар быў з тых, хто адчувае сваю поўную беспакаранасць і, што яшчэ горш, каму падабаецца здзекавацца з псіхічна хворых пацыентаў.

— Што трэба? — надзіва высокай фістулай спытаў ён.

Ага! Ты, паразіт, што ў старажытных егіпцян азначала бясплатнага мыйшчыка трупаў, пэўна, еўнух. І з адсутнасці магчымасці фізічнага кахання да жанчыны растуць карані твайго садызму. Цікава, хто табе яйцы адбіў? Шкада, што не я… Муж-

чынам я цябе не зраблю, але што значыць сапраўдны мужык, пакажу.

— Мы сябры Ігара, — даволі ветліва адказаў я.

— Наведванне ў нас з сямнаццаці гадзін, а зараз валіце адсюль!

Ну не! Гэта ўжо занадта нават для такога цярплівага чалавека, як я.

— Было ў бацькі тры сыны, усе трое Васілі, і абодва хамы! — праспяваў я. — Чуў такую песню? Сам прыдумаў! Яна пра цябе, haedus! Гэта па латыні, а па-беларуску — казёл!

Санітар вырачыў вочы, хворыя абярнуліся і падышлі бліжэй, але раптам пачуўся гук, які выдаюць капыты каровы, калі яна вылазіць з балота на сухі бераг. Гэта Алесь сваім брудным чаравікам прылажыўся да неабдымнага зада медыцынскага работніка.

— Гэта табе падсрачнік! — крыкнуў ён.

Санітар павярнуўся, каб кінуцца на крыўдзіцеля, але ў гэты час Дзіма красоўкай, якая была не чысцей за чаравік Алеся, зрабіў аўтограф на ўжо асвоенай вялізнай мішэні.

— А гэта паджопнік!

На тварах пацыентаў з'явіліся ўсмешкі. Як жа! Крыўдзяць і здзекваюцца з істоты, якая глумілася над імі.

— А гэта каралеўскі пендаль! — выгукнуў я, ад душы паставіўшы сваё кляймо паверх аўтографаў сяброў.

Хворыя смяяліся, а санітар быў разгублены. Упершыню насміхаліся з яго, некалі грознага і недатыкальнага. Я глядзеў на Ігара. Зараз на яго твары адлюстраваліся нейкія пачуцці. Ён крыкнуў: «Зміцер, атас!» Ды было позна. Моцны ўдар адкінуў мяне на тры метры і прыляпіў да ствала старой таполі. Але гэта быў не ўдар кулаком, а нешта іншае. Я ўспомніў, як у студэнцкія гады ўзяўся рамантаваць разетку і мяне шандарахнула токам. Цяпер было нешта падобнае, толькі ў некалькі разоў мацнейшае. З вачэй пасыпаліся іскры, ад якіх можна было падкурваць цыгарэты. І праз гэтыя іскры я бачыў, як на санітара кінуўся Ігар, як першы дакрануўся да яго нечым падобным на карот-

кую палку, як мой сябра пакаціўся па пажоўклай траве, як патухлі ўсмешкі на тварах хворых, як Дзіма стаў перад санітарам у баявую стойку. Але хопіць валяцца! Я крыкнуў:

— Сынку, я сам! Дай адвесці душу!

— Баця, у яго электрашокер. Мадэль «Скарпіён». Распрацаваны для супрацоўнікаў ахоўных агенцтваў. Мае першы клас магутнасці, прабівае адзенне да трох сантыметраў, таму не падстаўляйся. І помні першае правіла прапара Мурашкі!

Гм, ён назваў мяне бацем. Прыемна, чорт вазьмі! Але і падкалоць не забыўся. Таксама мая школа! Да мяне падбег юнак, які ніяк не мог саўладаць са сваімі рукамі, і крануў за рукаў:

— Дзядзя, ён б'е нас гэтай палкай. Адбяры ў яго палку!

Мая душа перавярнулася. Хворых электрашокерам?!! Ну трымайся, паскуда!

Я абняў юнака і, стрымліваючы слёзы, сказаў:

— Не бойся, Птаха. Ён больш нікога біць не будзе!

— Хадзі, і табе выпішу! — праверашчаў санітар.

Краем вока я заўважыў, як сябры паднялі Ігара і прывялі ў прытомнасць. Пара! Трэба супакоіцца. Мясіць гэтага кабана кулакамі бессэнсоўна. Трэба нешта іншае... У вас ёсць план, містэр Фікс? Ужо ёсць! У ім дзве галоўныя дзеючыя асобы: айкідо і народны гумар.

— Мальцы, — звярнуўся я да хворых, — вы ведаеце, чаму гэты кабан такі тоўсты, а голас мае як у цэлкі? Яго вылегчылі! Яйцы чык-чык!

Хворыя засмяяліся.

— Давайце скажам разам:

Яйцы чык-чык,  
Ты не мужык!

Я пачаў дырыжыраваць хорам пацыентаў.

— Яйцы чык-чык,  
Ты не мужык! —

весела разносілася па старым парку.

Кабан не вытрымаў. З нечаканым спрытам ён кінуўся на мяне. Я ўхіліўся і выпісаў яму пендаля. Хворыя рагаталі, як на канцэрце Райкіна. Санітар развярнуўся і, размахваючы шокерам, рынуўся ў атаку. Пара! Я перахапіў і зафіксаваў у паветры руку з дубінкай, падставіў сцягно і, калі туша, узляцеўшы ў паветра, пачала пузам уверх апускацца на зямлю, прысеў і падставіў калена пад руку санітара вышэй локця. Спачатку пачуўся хруст, а потым віскат парасяці ў час аперацыі абразання. Не, канцэрт альціна нам не патрэбны. Пара даць заспакаяльнае. Я дакрануўся «Скарпіёнам» да нагі санітара і націснуў кнопку. Той тыргануўся, выключыў віскат і заціх. Хай адпачывае. Хворыя спалохана маўчалі. Юнак падбег да мяне:

— Дзядзька, вы яго не забілі? Не трэба забіваць…

— Не, Птаха, хутка ён ачуняе. Але біць вас больш не будзе.

— Тады добра!

Такія ўжо мы людзі, беларусы, — шкадуем нават сваіх ка́таў!

— Дзіма, забяры шокер. Можа, яшчэ спатрэбіцца. Вы с Алесем пабудзьце з хворымі, а мы з Ігарам пойдзем да доктара.

— Ігар, вядзі мяне да свайго доктара. Як яго завуць?

— Рамуальд Самойлавіч.

— Добра, пайшлі! Калі цябе павінны выпісаць?

— Заўтра.

— Нічога, выпішуць сёння.

— Наўрад ці…

— Ты дрэнна ведаеш свайго сябра.

За размовай мы падняліся на трэці паверх і спыніліся ля кабінета доктара.

— Ігар, размову буду весці я. Ты толькі ўсміхайся і паддаквай.

Мы зайшлі ў кабінет. Доктар перадпенсійнага ўзросту ўважліва акінуў мяне позіркам сваіх вочак-маслін.

Я прыклеіў да твару галівудскую ўсмешку, упэўненым крокам падышоў да яго і моцна пацісную руку.

— Рамуальд Самойлавіч, я бізнесмен з Мінска Зміцер Аляксеевіч! Вельмі рады вас бачыць! Дарэчы, вам прывітанне ад Людмілы Генрыхаўны з камітэта.

— Дзякуй. Адкуль вы яе ведаеце?

— Цётка мая, маміна сястра.

Твар доктара адлюстраваў пачцівасць.

— Рамуальд Самойлавіч, я хацеў бы пагутарыць з вамі аб маім сябры Ігары.

— Добра, хай ён пачакае нас на калідоры.

Ігар з палёгкай на твары выйшаў з кабінета.

— Ведаеце, Зміцер Аляксеевіч, Ігара можна вылечыць... Не, вылечыць — гэта занадта моцна сказана. Але падтрымліваць яго жыццё ў належным камфортным стане, каб ён перастаў трапляць да нас, можа толькі ўтульная хатняя атмасфера і нейкае творчае захапленне. Да сваёй жонкі яму лепш не вяртацца. Дарэчы, скажу вам па сакрэце — яна лячылася ў нас ад алкагольнай залежнасці, але зноў сарвалася.

— Я ўсё зраблю для таго, каб дапамагчы Ігару. Вось вам мая візітоўка.

Пад візітоўку я паклаў складзеную ўдвая стодоларавую купюру. Доктар гэта бачыў.

— Рамуальд Самойлавіч, я прашу, каб вы зараз выпісалі Ігара. Я забяру яго з сабой у Мінск, пакуль ён не скасуе шлюб і не разменяе кватэру, а мая фірма зробіць для вас бясплатны буклет і шыкоўныя візітоўкі.

— Наогул, тэрмін яго выпіскі заўтра, але калі вы так настойваеце, то можна і сёння. Я зараз скажу, каб яму выдалі адзенне. Няхай пераапранаецца, я за гэты час аформлю паперы. Яшчэ выпішу рацэпт на лекі, якія Ігар павінен будзе прымаць першы час.

— Вялікі дзякуй, Рамуальд Самойлавіч!

Я пацінуў доктару руку і выйшаў на калідор.

— Ігар, пераапранайся! Потым забяры паперы — і на выхад. Мы будзем цябе чакаць. На ўсё пра ўсё табе пятнаццаць хвілін!

— Я пастараюся!

Вось ужо і радасныя ноткі з'явіліся ў голасе. Цудоўна!

Я вярнуўся да сяброў. Санітар ужо ачуняў і змучана стагнаў. Я схіліўся над ім:

— Што, баліць?

— Ты за ўсё адкажаш!

— Адказваць я буду толькі перад сваім сумленнем, а табе — кіпець у смаляным катле. Вось табе абязбольваючае.

Я адкаркаваў чакушку гарэлкі і падаў санітару.

— Не буду! — піскнуў ён.

— Дзіма, падай шокер!

— Не трэба!! — узмаліўся санітар.

— Пі, паскуда!

Санітар у некалькі глыткоў асушыў чакушку, крактануў і занюхаў рукавом. Школа!

— Мальцы, звярнуўся я да хворых, — скажаце, што гэты кабан напіўся, паслізнуўся і зламаў руку. Згода?

— Згода! — загулі хворыя.

Я супакоіўся толькі пасля таго, як мы сустрэлі Ігара, прайшлі вяртушку, селі ў машыну і пакінулі тэрыторыю бальніцы.

— Ігар, у цябе ключы ад кватэры ёсць? — спытаў я сябра.

— Ёсць.

— Ты хочаш скасаваць шлюб са сваёй кобрай, або будзеце співацца разам? Толькі ведай, што жанчыны больш вынослівыя за нас, мужыкоў. Яна перажыве цябе і пару вадзікаў у дадатак.

— А што, яна з Вадзікам?

— Муж, як заўсёды, аб усім даведваецца апошнім. Зараз сам пабачыш.

— Алесь, замок у дзверы ўрэзаць зможаш?

— За дваццаць хвілін, але патрэбны інструменты.

— Знойдзем!

Я заехаў у гаспадарчую краму і купіў надзейны замок. Потым мы пад'ехалі да кватэры Ігара і падняліся на трэці паверх.

— Мальцы, тут можа быць Вадзік, таму размяркуем абавязкі. Алесь і Дзіма — нейтралізуеце Вадзіка, а мы з Ігарам прыгледзім за Стэлай, хаця я б памяняўся з вамі месцамі.

— Першае слова даражэй за другое, — засмяяўся Дзіма.

— Ігар, давай ключы.

Я акуратна ўставіў ключ у замок і, стараючыся не шумець, павярнуў два разы. Дзверы ціхенька рыпнулі, і мы зайшлі ў кватэру. Я прыклаў палец да вуснаў і зазірнуў на кухню. Дзве пустыя «бомбы» з-пад «чарніла» і недапітая паўтарачка піва гаварылі аб тым, што пахмелле плаўна перацякло ў чарговую п'янку. Мы падышлі да спальні, я рыўком адчыніў дзверы і голасам Джыгурды зароў:

— Рукі ўгору! Мордай у падлогу! Крок у бок лічыцца пабегам, страляю без папярэджання!

Вадзік, які ў тых жа брудных трусах ляжаў на ложку, закінуўшы нагу на п'яную Стэлу, падскочыў і кінуўся да дзвярэй. Алесь з Дзімам былі напагатове. Ігар, забыўшыся, што ён павінен сачыць за Стэлай, падбег да Вадзіка і пачаў хвастаць таго па фэйсе. Галава полацкага дон Хуана матлялася, як флюгер пад парывамі ветру.

— Хопіць, — спыніў я сябра, — ты прыказку памятаеш: сучка не захоча — кабель не ўскоча? Яна пра тваю жонку.

— Я заб'ю гэту паскуду!

— І зноў сядзеш. Тым больш што твая аматарка паэтаў срэбнага веку яўна перабрала. Смерць у сне для яе будзе занадта высокай узнагародай. Мы зробім інакш.

Стэла напаўспушчанай гумавай лялькай валялася на ложку, і яе некалі прыгожае цела зараз нічога акрамя агіды не выклікала.

— Ты рэкламу «Тайда» бачыў? — звярнуўся я да Вадзіка. — Дык вось мы прыйшлі да цябе. Пойдзем у ванны пакой.

Я затыкнуў адтуліну ў ванне і на поўную моц уключыў халодную ваду.

— Цёпленькая не пойдзе, не спадзявайся, — звярнуўся я да Вадзіка, які бязвольна боўтаўся ў дужых руках хлопцаў. — а дзе ж наш «Тайд»? Няма... Бачу — твая каханка падтрымлівае айчынных вытворцаў. Ёсць «Лотас» фірмы «Бархім», што азначае Барысаўскі завод бытавой хіміі. Выдатны сродак! Калі пачнецца вайна і нас акупіруюць войскі НАТА, гэтага парашку будзе дастаткова, каб адправіць дадому ўсіх амерыканскіх салдат.

Я сыпануў парашку ў ванну. Пена ўзнялася да самых краёў.

— Сябры, макніце!

Некалькі дужых рухаў — і Вадзік, ускрыкнуўшы ад ледзяной вады, ужо сядзеў у ванне, і я кінуў яму мачалку.

— Мыйся, каб мама не лаялася! І трусы памый, а то не зразумела, як ты адрозніваеш, дзе перад, а дзе зад, бо ў цябе жоўта і тут, і там.

Вадзік калаціўся, як асінавы ліст, і ляскаў зубамі, але загады выконваў.

— Зміцер, — сказаў Алесь, — не заводзь эксперымент занадта далёка, бо Стэла не ў тым стане, каб яго адагрэць.

— Добра.

Я дастаў затычку, уключыў гарачую ваду і накіраваў шланг на Вадзіка. Ён аж зажмурыў вочы ад задавальнення. Вось бомж марцовы! Я кінуў яму ручнік.

— Выцірайся! І трусы выкруціць не забудзься. Ты дзе прапісаны, хлопча?

— У вёсцы Замошша. Там маці жыве.

— А што ты тут забыўся? Захацеў далучыцца да культурных каштоўнасцей славутага града Полацка?

— Ды Стэла мяне сама запрасіла...

— А ты рады старацца. Выпіць на халяву ды каля бабы пагрэцца. А ты ведаеш, што Стэла замужам?

— Ведаю.

— Дык вось, Вадзік, слухай мяне ўважліва, я двойчы паўтараць не буду. Зараз ты аддасі нам ключ ад гэтай кватэры і забудзеш сюды дарогу. Потым вернешся ў роднае Замошша. Падымай калгас. Другі варыянт — міліцыя. Трэці — ЛТП. Што выбіраеш?

— Дамоў паеду.

— Правільна. Тры хвіліны на зборы. Час пайшоў.

Вадзік сабраўся за дзве.

Ігар знайшоў долата, малаток і нават электрадрыль, і Алесь узяўся за справу.

— Сябра, збяры самыя неабходныя рэчы. Да размену кватэры ты будзеш жыць у мяне, — звярнуўся я да Ігара.

— Добра.

Праз пятнаццаць хвілін замок быў урэзаны. Мы зачынілі пакой і выйшлі з кватэры. Стэла так і не прачнулася.

Я зайшоў у гастраном, купіў ежы, і мы селі ў аўто.

— Мальцы, пабываць у Полацку і не павітацца з Сафіяй было б вар'яцтвам, таму — да гістарычных каштоўнасцей!

Белая прыгажуня царква на фоне свінцова-шэрага неба выглядала выратавальнымі дзвярыма надзеі ў тую райскую краіну, куды кожны ўпотай марыць патрапіць, а тое ўзвышша, на якім яна велічна стаяла, паказвала, колькі намаганняў трэба прыкласці для гэтага.

Мы падняліся па прыступках і падышлі да Барысава каменя.

— Пакладзіце далоні на камень, заплюшчыце вочы і загадайце сваё самае патаемнае жаданне, — параіў я і сам так зрабіў.

Шурпаты валун, якога на сваёй магутнай спіне прынёс сюды ледавік з далёкай Скандынавіі, памятаў маладосць нашай планеты і будзе бачыць яе апошнія хвіліны. Што для яго чалавечы лёс? Імгненне. Але мудрая веліч і моц знакамітага каменя надалі нам спакою і рашучасці, бо, калі я расплюшчыў вочы, на мяне глядзелі сябры, гатовыя ісці са мной да канца.

## Падарожжа чацвёртае. Лёва



Выехаўшы з горада, мы зрабілі прыпынак на беразе невялікага лясного возера. Пачынала змяркацца. Сонейка, перад тым як патануць у азёрнай глыбіні, на хвіліну райскай жар-птушкай выглянула з-за аблокаў. Агністая сцяжынка на люстраной гладзі возера запрашала пабегчы па ёй да барвовага дыска, але розум не дазволіў паддацца марам: па вадзе мог хадзіць толькі Ісус... А чаму мы не можам? Можа, Усявышні або прышэльцы, якім была патрэбна танная працоўная сіла, стварылі адмысловы абмежавальнік здольнасцей чалавека? Таму тыя з нас, каму цесна ў канцлагеры існавання, па баках якога стаяць тры вялікія ахоўныя вежы: Праца, Ежа, Сон — і адна маленькая (ну вельмі маленькая!) — Секс, спрабуюць вырвацца адтуль з дапамогай алкаголю, тытуню, пяёту і медытацыі? Рэлігія (у гэтым я цалкам згодны з класікам марксізму-ленінізму) — адзін з дазволеных варыянтаў наркотыкаў, і крылаў чалавеку не дае. Але досыць філасофіі, бо, занадта паглыбляючыся ў гэтыя адвечныя пытанні, можна патрапіць у Навінкі... Або на могілкі.

— Мальцы, вунь абсталяванае месца для бівака, таму збіраем галлё! Хто назбірае больш, атрымае першы кавалак смажанага мяса. За працу! — загадаў я.

Сябры пастараліся, і хутка вогнішча, патрэскваючы ад задавальнення і кідаючы ў паветра феерверкі іскраў, ласавалася сухім веццем. Раскладны мангал, рашотку для смажання мяса і пакунак вугалля я заўсёды трымаю ў машыне, таму ўжо праз паўгадзіны над мангалам шкварчэла мяса, дразнячы нас апетытным пахам.

— Зміцер, слінай сыду! Давай мяса! Мя-а-а-са хачу! — роў Алесь.

— Пачакай, бо калі ты з'ясі недасмажанага мяса, то сыдзеш не слінай, а нечым іншым.

Тым часам на сталешніцы я разлажыў аднаразовы посуд, паклаў смажанага судака, марынаваныя гурочкі, трохлітровік соку і хлеб. Павагаўшыся, паставіў бутэльку гарэлкі. Для выпрабавання. Нарэшце мяса было гатова, і я разлажыў яго на талеркі. Адкаркаваў бутэльку полацкай гарэлкі, якую купіў толькі таму, што мне спадабалася яе назва «Пятровіч». Наліў Дзіму, Ігару і спытаў у Алеся: «Можа, табе наліць? Сербанеш сотку?» Алесь, які апошнія хвіліны глядзеў на бутэльку, як малпа на Каа, ірвануў у лес, і адмысловыя гукі, якія данесліся адтуль, сумным зязюльчыным рэхам паведамілі нам, што вожык аддаў сваё жыццё не дарэмна... Мы пачакалі, пакуль Алесь схадзіў да возера, памыўся і з бледным тварам сеў ля вогнішча.

— Калі яшчэ хто-небудзь прапануе мне гарэлкі, я таго гада...

— Фэйсам аб тэйбл! Зразумела, дружа. Але табе трэба навучыцца быць абыякавым да празрыстага і не вельмі празрыстага зелля, бо абыякавасць у гэтай справе — прыкмета ўпэўненасці ў сабе. Прабач за дурную прапанову, а піць мы з табой будзем сок. Маркоўны. З полацкіх палёў і агародаў. У ім столькі караціну, што нават ноччу ты будзеш бачыць, як філін. Сябры, — я працягваў свой рэй, — сёння з намі наш стары сябра. Ігар, я не Воланд, але няхай франтавыя сто грамаў будуць тым цудадзейным элексірам, які вярнуў да жыцця Майстра, а табе дапаможа забыць твае праклятыя апошнія гады. За цябе!

Ігар з Дзімам выпілі, і мы наваліліся на мяса. Я ўзяў бутэльку з недапітай гарэлкай, падышоў да возера і шпурнуў у цёмную люстраную роўнядзь. Булькнуўшы, яна пайшла на дно.

— Зміцер, ты нейкага карася зрабіў алкаголікам. Навошта спайваць падводны свет? — выдаў Алесь.

— Вадзянік за ім прыгледзіць. «Мішкі», з гэтага моманту ў нашым гурце ўводзіцца рэжым поўнай цвярозасці. Ён будзе дзейнічаць да дня нашага канцэрта.

— Якога канцэрта? — запытаўся Ігар.

— Па дарозе ўсё раскажам.

Мы павячэралі і моўчкі сядзелі, гледзячы на агонь. З усіх стыхій, на мой погляд, агонь самая чароўная, прыцягальная і неўтаймаваная. Гэты дар Праметэя дапамог першабытнаму чалавеку выжыць сярод дзікай прыроды, і ён жа заўсёды ўтрымлівае ў сабе смяротную пагрозу. Ён, як котка з казкі Кіплінга, жыве сам па сабе. Але з двух варыянтаў канца любой жывой істоты — згніць або згарэць — я выбраў бы агонь.

Мы прыбралі смецце, селі ў машыну, я запусціў рухавік, уключыў фары і па прасёлачнай дарозе выехаў на шашу Полацк — Віцебск. Алесь з Ігарам ціхенька размаўлялі, Дзіма даваў храпака, а я на хуткасці 70 кіламетраў ехаў да абласнога цэнтра. У ночы свае правы, яна не шкадуе легкадумных і патрабуе павагі да сябе. І яшчэ: яна хавае пачвар, якія жывуць у нашых галовах…

На FM я злавіў «Мелодыі нашага веку» і з задавальненнем слухаў старыя хіты. Неўзабаве на небе паўночным ззяннем высвеціўся агмень вялікага горада, а потым мірыядамі светлякоў стаў бачны і сам Віцебск. Я паехаў паралельна трамвайным рэйкам, пакінуў з правага боку вакзал, звярнуў налева, праехаў мост праз Дзвіну і спыніўся ля гасцініцы «Лучоса».

— Ці ёсць свабодныя нумары? — спытаўся я ў адміністратара, калі мы зайшлі ў фае.

— Ды ў нас толькі на «Славянскім базары» аншлаг, а зараз ціха. Два двухмесныя нумары на сёмым паверсе з відам на Дзвіну вас задаволяць?

— Канешне. Афармляйце.

— Мальцы, я з Ігарам, а Алесь з Дзімам. Згода?

— Згода, хаця я б выбраў суседства з Анджалінай Джалі, — адказаў Алесь.

— Бач ты, пасля харчовага прачнуўся і сексуальны апетыт. Але гэта ўсё інстынкты, а я чакаю, калі ў цябе прачнецца апетыт да творчасці.

— Ды я заўтра ж з сухастоіны зраблю тваю скульптуру.

— Па-першае, сухастоіна гучыць не вельмі эстэтычна і сексуальна, а па-другое, ты лепш зрабі з вішні некалькі пар барабанных палачак для Дзімы, бо ў крамах яны каштуюць быццам вырабленыя з гандураскага махагону.

— Паспрабую. Але мне патрэбен такарны станок.

— У Мінску знойдзем, а вішнёвых дрэў у наваколлі хапае.

Так за размовамі мы падняліся на сёмы паверх.

— Мальцы, адбой! Заўтра сустрэнемся з Лёвам і вырашым, што рабіць далей. Добрай ночы!

— І вам салодкіх сноў з відэафільмам пра гарэм турэцкага султана! — адказаў Алесь.

— Не зваліся з ложка, Асман Вялікі!

Наш пакой быў звычайным і безаблічным, але атапленне працавала, была гарачая вада і чыстая бялізна. Што яшчэ патрэбна стомленаму падарожніку?

— Зміцер, я прыму душ, бо дома не паспеў, — вінавата прамармытаў Ігар.

— Канешне, сябра. З-за вадзікаў нікуды не паспяваеш, проста бяда!

— І не кажы.

Ігар знік у ванным пакоі, а ў мяне зазваніў мабільнік. Я пачуў голас Томы, і хваля пяшчоты і жадання прабегла па маім згаладалым па каханні целе.

— Добрай ночы, любы! Ты пра мяне зусім забыўся…

— Томачка, радасць мая, я так сумую без цябе!

— А пабачыць мяне хочаш?

— Вядома! Але як гэта зрабіць?

— Я стаю на Смаленскай вуліцы.

— Дзе?!

— Вядома, не ў Карагандзе, а ў Віцебску.

— Цудоўна! Праз пятнаццаць хвілін мой чатырохколавы конь цябе падбярэ. Перайдзі на правы бок вуліцы.

— Чакаю!

Я пастукаўся ў дзверы ваннага пакоя.

— Ігар, я на сустрэчу да каханай. Не чакай мяне!

— Поспехаў!

Матор «Пежо» яшчэ не паспеў астыць. Зноў праз мост, вакзал пакідаю злева. Вось і Смаленская вуліца. Збаўляю ход, і пад ліпай з абляцелай лістотай бачу адзінокую сумную постаць. Тармажу. Выбягаю. Сціскаю ў абдымках каханую, і пацалунак чароўным скафандрам пяшчоты адгароджвае нас ад замерзлага начнога горада. Хутчэй у машыну. Пара рухаў — сядзенні зլажыліся і стварылі канапу, не такую шыкоўную, як

у офісе, але лепшую, чым якая-небудзь раскладушка. Пакуль я галодным Тарзанам зрываў з Томы адзенне, яна распранала мяне. Прэлюдыю скароцім да мінімуму — яна даўно пракручана ў нашых галовах. Маэстра, музыку! Нябачны дырыжор узмахнуў палачкай, і ў тэмпе lento загучала першая частка сімфоніі кахання. Два згаладалыя целы дотыкамі пальцаў, далоняў, кунежыннем вуснаў пачалі ўспамінаць адзін аднаго. І вось шлях у рай знойдзены. Andante другой часткі плаўна перайшло ў allegro moderato. Рэсоры машыны пачалі пагойдвацца і рыпець. «Пара мяняць амартызатары», — машынальна зазначыў я. Allegro! Presto!! Vivo!!! Vivace!!!! Трыумфальны крык узаемнай жарсці і Яе Вялікасць Coda!!! Сэрца, якое трапяткой ластаўкай ірвалася ў вырай, пачало супакойвацца і нарэшце знайшло ўтульнае гняздзечка ў грудной клетцы.

— Томачка, усё было цудоўна, але не магла б ты зняць свае прыгожыя ножкі з даху маёй беднай машыны. Я даўно марыў аб люку, але калі ты яго зараз зробіш сваімі пяткамі, то мы змерзнем, як дзве малпы ў Антаркцідзе.

— Маўчы, варвар, і радуйся, што я ўзнагародзіла цябе такімі пагонамі, — засмяялася Тома. — Памятаеш анекдот пра сакратарку, якая пакрыўдзілася на шэфа і, пахлопаўшы таго па плячы, сказала: «Нагі маёй тут больш не будзе!»?

Я не паспеў адказаць, як нехта пастукаў у бакавое шкло. У цьмяным святле начнога ліхтара я заўважыў тры постаці міліцэйскага нарада. Апусціў бакавое шкло. У салон прасунулася галава маладзенькага сяржанта.

— Што тут адбываецца? Чаму гайдаецца машына і чутны крыкі?

— Мяне забіваюць... — гаротна прашаптала Тома.

— Вам патрэбна мая дапамога?

— Не, няхай забіваюць далей, мой жэнераль!

Сяржант пасвяціў ліхтарыкам. Тома бессаромна і павольна расхінула свае малочна-белыя калені. Міліцыянер стукнуўся галавой аб дзверы машыны і істэрычна праверашчаў: «Вы што гэта? Вы што сабе дазваляеце?! Не паложана!»

— Мы едзем у гасцініцу. Праз дзве хвіліны нас тут не будзе, камандзір. Прабачце маю жонку за нястрыманасць. Яна ў мяне такая...

— Ла-а-дна, — прамармытаў сяржант, яшчэ раз коса зірнуўшы на Томіна хараство. — Каб, гэта, быў парадак!

— Парадак будзе. Дзякуй за пільнасць!

— Стараемся.

Я падняў шкло і, стрымліваючы прыступ рогату, прашаптаў:

— Томачка, ну ты д'ябаліца! Беднага сяржанта ледзьве да інфаркту не давяла.

— Мур-р-р!

— Мя-а-аў!

Я ўпоцемках нацягнуў трусы, пералез на сядзенне кіроўцы і крануўся з месца. Ад'ехаўшы сотні тры метраў, я зірнуў уніз і ўбачыў, што сяджу ў Томіных ружовых ажурных панталончыках. Я зайшоўся рогатам і так ціскануў па тармазах, што трэснуўся лбом аб руль. Спрацаваў надзейны пежоўскі эйрбэк, крышка, якая адляцела, зноў стукнула па маім бедным ілбе, і падушка бяспекі плаўным і смяротным пацалункам пачала прыціскаць мяне да сядзення. Я паспеў прасіпець: «Тома, рэж падушку!», і эластычнае палатно сквапным засосам заляпіла мне твар. «Яшчэ б намазаць гіпсам, і атрымалася б маска. Пасмяротная», — падумаў я. Тома не разгубілася. У сваёй сумачцы пад назвай «Тысяча і адна дробязь» яна знайшла адзіную патрэбную зараз рэч — манікюрныя нажніцы — і тыцнула імі ў падушку. Засіпела паветра, і я адчуў подых свабоды.

— Дзякуй, каханая, выратавала! Паглядзі, якія на мне трусы.

Тома зірнула і, зайшоўшыся рогатам, стукнулася галавой аб дах машыны.

Карацей, за сняданкам, дзе я пазнаёміў Тамару са сваімі сябрамі, я сядзеў з гузаком на лбе, а мая каханая чухала збітую патыліцу.

— Зміцер, хто табе ў лоб заехаў? — спытаўся Алесь. — Чаму нас не паклікаў на дапамогу?

— Ды гэта Тома прыраўнавала мяне да адміністратаркі, з якой я пажартаваў, і трэснула мяне па лбе.

— Правільна зрабіла. Калі ты побач з такой жанчынай, то іншых не трэба заўважаць.

— Дзякуй за камплімент, Алесь, — сказала Тома. — а гузак яму зрабілі ў бары, дзе ён паказваў стрыптыз у ружовых жаночых панталончыках. Бар аказаўся не той арыентацыі.

— Ён што, памяняў арыентацыю? Побач з такой жанчынай?! Томачка, я стары арганаўт...

–... і алканаўт, — уставіў я.

— ... які ўсё жыццё правёў у пошуках залатога руна...

— а знайшоў гуана, — мае пяць капеек.

— ... і зараз убачыў яго перад сабой, і калі вам надакучыць гэты паліграфіст, я буду насіць вас на руках...

— ... пакуль не зараблю грыжу...

— ... і выражу вашу скульптуру...

–... з сухастоіны, — падсумаваў я.

Ад нашага рогату зазвінеў посуд на стале, наведвальнікі кафэ спалохана азірнуліся, а афіцыянт прыклаў палец да вуснаў, патрабуючы, каб мы супакоіліся.

— Добра, смех смехам, але час тэлефанаваць Лёву. Дарэчы, хто-небудзь бачыўся з ім пасля ўнівера?

Аказалася, што пра Лёву ніхто нічога не ведае.

— Та-ак, тэлефон яго ў мяне толькі хатні.

Трубку знялі даволі хутка.

— Добры дзень! Можна запрасіць да тэлефона Льва Сямёнавіча?

— Я слухаю.

Голас амаль не змяніўся.

— Лёўка, здароў, сябра! Гэта Зміцер, твой універсітэцкі таварыш з «Мішак». Памятаеш такога?

— Памятаю. А ты адкуль тэлефануеш?

— Ды мы зараз у Віцебску ўсім нашым былым гуртом. У гасцініцы «Лучоса». Можам закаціць да цябе!

— Зміцер, я зараз заняты, — прамармытаў Лёва, — а вечарам буду іграць у рэстаране той жа «Лучосы». Прыходзьце, там і сустрэнемся.

— Згода. Да сустрэчы!

Не адчуў я радасці ў яго голасе. Не адчуў.

— Што, Зміцер, бачу Лёўка нам не вельмі рады? — спытаўся Ігар.

— Пэўна... Але калі ён не захоча прыняць удзел у канцэрце, на нашым мерапрыемстве можна ставіць кропку. Тлустую.

— Ды мы сыграем і без яго! — выказаўся Алесь.

— Вядома, але па ўмове кантракта мы павінны выступіць у ранейшым складзе. Таму ўвечары перамовы будзем весці вельмі далікатна. Я буду гаварыць, а вы паддаквайце.

— Які ты дыпламат, мы ўжо бачылі. У Полацку, — уздыхнуў Алесь.

— Нічога, я выпраўлю свае памылкі і буду хітрым, як Дызраэлі. А зараз у нас вольны час. Пагуляем па Віцебску.

Мы выйшлі з гасцініцы і спыніліся ля моста праз Дзвіну.

— Нешта не надта падобна на жанчыну гэтая дзікая рака, — выказалася Тома.

— Розныя жанчыны бываюць, мая радасць. Але тут ты маеш рацыю: раней рака называлася Рыдван, або Эрыдан. Вунь на той пляцоўцы з правага боку, па легендзе, спынялася княгіня Вольга.

— Гэта тая «міласэрная» жанчына, якая так жорстка адпомсціла драўлянам за смерць свайго мужа? — спытаўся Ігар.

— Так, а яе мужа, дарэчы, твайго цёзку, яны забілі з-за яго сквапнасці: яму падалося, што звычайнай даніны мала, і ён вярнуўся, каб зноў яе сабраць. Тады драўляне вырашылі, што калі воўк панадзіўся ў статак, то трэба яго выразаць. Сагнулі дзве бярозы, прывязалі да іх вершалін ногі Ігара і адпусцілі дрэвы. І атрымаліся са сквапнага князя дзве палавінкі...

— Жах які! — уздыхнула Тома.

— Па заслугах! — сказаў Дзіма.

— Але ж княгіня ім жорстка адпомсціла, — дадаў Алесь. — Спачатку яна першых паслоў драўлян, якія прыплылі да яе сватаць за свайго князя Мала, у якасці вялікага гонару прыняла на ладдзях, якія неслі слугі, а потым тыя ладдзі былі кінуты ў загадзя выкапаныя ямы і засыпаны зямлёй разам з жывымі людзьмі. Другіх паслоў драўлян Вольга зажыва спаліла ў лазні, а потым з войскам падышла да іх цэнтра — горада Іскарасценя. Сабраўшы даніну ў выглядзе трох галубоў і трох вераб'ёў з кожнага двара, яна загадала прывязаць кнот да лапкі кожнай птушкі, падпаліць яго і адпусціць птушак. Бедныя птахі жывымі факеламі вярнуліся да родных гнёздаў і спалілі горад. Хаця мне

здаецца, што з палаючым або нават тлеючым кнотам птушкі не праляцелі б і дзесяці метраў. Але прыгожая легенда назаўсёды застанецца легендай.

— Адсюль пытанне: лепш адразу скарыцца або змагацца, нават ведаючы, што прайграеш? — спытаў я.

— Вядома, змагацца! — усклікнуў Дзіма.

— Гэта твой юначы максімалізм, сынку, — уздыхнуў я. — За часы прыгнёту і тыраніі рабства для беларусаў стала нацыянальнай рысай, ад якой мы толькі зараз пачынаем пазбаўляцца... Я ўсё думаю: чаму ў трыццаць сёмым годзе, калі вынішчалі нашу інтэлігенцыю, ніводзін не аказаў супраціўлення? У многіх жа была ўзнагародная зброя. Чаму яны ішлі ў чорныя «варанкі», як бараны пад нож?

— Зміцер, у многіх жа былі сем'і, дзеці. Арыштанты хацелі сваёй ахвярай зберагчы родных і блізкіх, хаця ў большасці выпадкаў гэта не дапамагала, і жонкі ішлі ў Сібір, а дзеці — у дзіцячы дом, дзе ім нават прозвішча мянялі, — сказаў Ігар.

— Навошта мяняць прозвішча? — спытаўся Дзіма.

— Каб роду свайго не ведаць! Бязродны чалавек — быдла. А быдла лёгка сагнаць у статак, даць п'янага пастуха, які будзе рэзаць бізуном тых, хто занадта далёка адыдзе ўбок. А калі б ты ведаў, што твой продак быў шляхціцам, які пад Грунвальдам штабялямі клаў крыжакоў, то ўжо адно гэта не дазваляла б табе схіляць галаў перад рознай сваллотай! — выкрыкнуў я.

— Крамольныя рэчы гаворыце, в'юнаша! — хмыкнуў Алесь.

— Але справядлівыя!

Унутры мяне пачынаў закіпаць чайнік. Тома гэта адчула. Яна абняла мяне, пацалавала і прашаптала:

— Супакойся. Вакол сябры, я цябе кахаю — і гэта галоўнае, а мінулае мы не ў стане выправіць...

— Але было б добра, каб на памылках мінулага вучыліся і двойчы ў тую ж ляпёху не ступалі.

— Мы ўсё жыццё па ляпёхах топчамся, — падаў сумны голас Ігар.

— Давайце лепш таптаць вінаградныя гронкі і рабіць хванчкару!

— Правільна, сябра! — усклікнуў Алесь.

— Толькі для цябе вінаградны сок, а не віно.

— Згода! — засмяяўся ён. — Сваю цыстэрну я ўжо выпіў. Дарэчы, на тым беразе ракі Дом-музей Марка Шагала. Зойдзем?

— Абавязкова!

Шагал — мастак, якога адразу можна пазнаць з тысяч іншых. Пачаўшы з рэалізму, ён выпрацаваў свой непаўторны стыль з закаханымі, якія лунаюць, пеўнямі і каровамі ў блакітна-сінім каларыце любімых валошак. Яго палотны — гэта парыжскія сны аб віцебскім юнацтве.

Пасля наведвання музея Дзіма сказаў: «Я не зразумеў яго жывапісу...» Алесь яго супакоіў: «Хлопча, каб зразумець Шагала, трэба пачаць з наскальнага жывапісу, ікон, эпохі Адраджэння, дайсці да рэалізму, перайсці да імпрэсіянізму, мадэрнізму, прымітывізму, потым пазнаёміцца з яго біяграфіяй і творчым шляхам — толькі тады можна нешта зразумець, хутчэй — адчуць. Калі не супраць, я займуся тваёй мастацкай адукацыяй».

— Вядома, не супраць!

— Як вы думаеце, ці лічылі сябе беларусамі мастакі знакамітай віцебскай школы: Шагал, Кандзінскі, Пэн? — спытаў Алесь.

— Вядома, — упэўнена зазначыў Дзіма, — яны ж тут нарадзіліся!

— Наіўны ты хлопча, — уздыхнуў Ігар, — любы яўрэй, нават калі ён нарадзіўся ў Афрыцы, сваёй радзімай лічыць Ізраіль.

— Давайце не будзем абмяркоўваць яўрэйскае пытанне, — засмяяўся я, — на ўсё вам адкажа Лёва. Вечарам.

— А я думаю, — умяшалася Тома, — што сваёй радзімай любы творца лічыць тую краіну, якая дала магчымасць раскрыцца яго таленту, таму французы лічаць Шагала сваім нацыянальным мастаком. Як, дарэчы, і Суціна.

— Магчыма, ты маеш рацыю, мая радасць, але чым тады называць месца нараджэння? Альбо для творчых асоб увесці асобную тэрміналогію? Тут пытанне складанае... Цябе паслухаць, дык беларусы зусім застануцца без творцаў.

— А мы! — усклікнуў Алесь.

— Вось іменна, дружа!

Мы яшчэ з гадзіну пагулялі па горадзе, але пачаўся нудны дождж, і нам прыйшлося вярнуцца ў гасцініцу.

Увечары мы сядзелі за столікам рэстарана. Я разглядваў наведвальнікаў, спрабуючы вызначыць іх сацыяльны статус. Усіх можна было ўмоўна падзяліць на тры катэгорыі. Да першай адносіліся бізнесмены сярэдняй рукі з каханкамі. Зручна: можна павячэраць, патанчыць і зняць нумар на ноч. А правіла: хто нас вячэрае, той і танчыць — яшчэ ніхто не адмяняў. Да другой катэгорыі адносіліся былыя і будучыя зэкі. У краіне, дзе сядзеў кожны чацвёрты, зэкі складаюць адмысловае сацыяльнае саслоўе з уласнымі законамі, канстытуцыяй і нават індустрыяй адпачынку. Яшчэ былі гандляры з рынку, большасць якіх складалі каўказцы. Зараз яны не стаяць за прылаўкамі і не возяць садавіну з родных мясцін. Іх невялікія гандлёва-закупачныя фірмачкі аформлены на беларусаў. Яны жывуць у адзінокіх жанчын, якія на іх працуюць і спяць з імі, радуючыся такому жаночаму шчасцю. Іх можна сустрэць на аптовых рынках і базах, дзе яны купляюць наш, беларускі, тавар і потым нам жа прадаюць. Толькі ўдвая даражэй. Іх яшчэ можна пабачыць у банках, дзе яны мяняюць нашы зайцы на долары і адсылаюць сваім сем'ям у родны Баку. Ну і, вядома, у рэстаранах.

— Цікава, а калі б беларус прывёз на Каўказ машыну бульбы альбо антонавак, ці зрабіў бы ён там бізнес? — запытаўся я.

— Ты аб чым, каханы? — адазвалася Тома.

— Гэта так, — засмяяўся я, — думкі ўслых.

— Вяртаўся б ты адтуль, хлопча, не на ўласнай машыне, а ў цынкавай труне, — сказаў Алесь.

— На чым? «Чорныя цюльпаны» ўжо не лётаюць.

— На чорнай кабыле.

— Кіньце свой чорны гумар! — Гэта Тома спыніла нашу з Алесем пікіроўку.

Тым часам на невялікай сцэне з'явіліся музыкі. Клавішы, саксафон і гітара. Для кабакоў самае то. Загучала папуры з папсовых хітоў.

— А ў нашага Лёўкі неслабы мамон вырас, — заўважыў Алесь.

— І лысіна блішчыць, — дадаў Ігар.

— Многія жанчыны лічуць лысіну прыкметай сексуальнасці, — прамурлыкала Тамара.

— Не ведаў, што ты западаеш на лысых, — выказаўся я.

— Жанчына — гэта суцэльная загадка, — уздыхнуў Ігар.

На сцэне з'явілася салістка сярэдніх гадоў у бліскучай сукенцы з бакавым разрэзам да самай таліі, і паліліся песні. Айчынная і замежная папса, цыганскія і блатныя хіты — музыка, якая дапамагала разгарнуцца не толькі п'янай душы, але і кішэням. Браткі з суседняга століка ўжо двойчы заказвалі «Владимирский централ». Алесь не вытрымаў. Ён падбег да Лёвы, абняў яго і прашаптаў нешта на вуха. Той усміхнуўся і аб'явіў у мікрафон:

— Сябры, нашы адпачываючыя заўважылі, што сярод нас ёсць не толькі тыя, хто пабываў ва «Уладзімірскім цэнтрале». Для Алеся з азёрнага Лепеля гучыць «Таганка». — Лёўка, імітуючы голас Круга, зацягнуў:

— Таганка, все ночи, полные огня.
Таганка, зачем сгубила ты меня?
Таганка, я твой бессменный арестант,
Погибли юность и талант в твоих стенах.

Афіцыянт паставіў на наш стол бутэльку шампанскага і, паказаўшы галавой на браткоў ля сцэны, сказаў: «Вам прывітанне ад тых хлопцаў». Прыйшлося адказаць тым жа. А мы адпачывалі: пілі шампанскае (на сённяшні вечар я адмяніў «сухі закон»), падпявалі прывабнай салістцы, танчылі. Нават Ігар запрасіў Тому на павольны танец. Час ляцеў непрыкметна. Бліжэй да поўначы музыкі развіталіся і пакінулі сцэну. Лёва падсеў за наш столік. Пасля абдымкаў, прывітанняў і роспытаў я закінуў вуду з пакуль што голым кручком:

— Лёва, ты ведаеш, што праз месяц юбілей універа?

— Няўжо? Вось як час ляціць!

— Дарэчы, нас запрасілі выступіць.

— Каго гэта «нас»?

— «Мішак». Можа, адновім праграму і ўрэжам рокам па бездарожжы і распіздзяйстве?

— Ды кіньце вы, сябры! Парыцца дзеля аднаго выступлення? Мы ж не «Led Zeppelin». Ці, можа, потым зробім сусветны тур?

— Лондан і Парыж не абяцаю, затое па аграгарадках пранясёмся каметай, — выдаў Алесь. — Даяркі будуць табе пляскаць у далоні, а камбайнеры наліваць самагнёт.

Позіркам я папрасіў Алеся памаўчаць. Пара прычапіць прынаду.

— Дарэчы, спонсары абяцаюць заплаціць пяцьсот долараў...

— Усім?

— Кожнаму.

Вось ужо і вочкі загарэліся. Рэдкая рыба адмаўляецца ад залатога кручка.

— А як з рэпетыцыямі? — запытаўся Лёва.

— Нам здымуць залу з апаратурай.

— Я не магу пакінуць працу... — прамармытаў Лёва.

— Давай дамовімся так: ты ж у нас профі высокага палёту (ад ліслівасці яшчэ ніхто не паміраў). Таму я скіну па электроннай пошце ноты тваіх партый, а ты пару раз прыедзеш да нас на рэпетыцыі. За гэта спонсары накінуць табе яшчэ сотку баксаў. Згода?

— Згода!

Алесь падміргнуў мне і непрыкметна паказаў узняты ўверх вялікі палец.

–Yes-s-s!

# Падрыхтоўка да канцэрта



Бліжэй да поўдня мы ўжо былі ў сталіцы. Па дарозе я заехаў у Барысаў і пакінуў там Дзіму, дамовіўшыся, што паведамлю яму аб бліжэйшай рэпетыцыі. Хлопцаў завёз на сваю кватэру і загадаў адсыпацца, Тому падкінуў у офіс, а сам патэлефанаваў Насці:

— Добры дзень! Вас вітае гурт «Мішка касалапы».

— Ой, вельмі прыемна! Гэта Зміцер?

Жаночы голас быў нізкім і аксамітным. Многія мужчыны ад падобнага кантральта губляюць розум. Па маёй спіне прабегла нейкая незразумелая энергетычная хваля.

— Так, гэта я. Хацелася б сустрэцца, пагутарыць...

— А зараз можаце?

— Магу.

— Цудоўна. Прыязджайце. Чакаю вас!

Яна паведаміла адрас. Ужо праз чвэрць гадзіны я пад'ехаў да шыкоўнага офіса вядомай фірмы. Ахоўнік спытаў да каго і, пачуўшы прозвішча, без размоў прапусціў мяне. Еду на трэці паверх. Вось і кабінет, дзе на шыльдзе пад словамі «Намеснік галоўнага дырэктара» красавалася прозвішча Насты. Я пастукаў у дзверы. Ветлівая сакратарка ўсміхнулася, пачуўшы маё прозвішча, і правяла ў кабінет сваёй кіраўніцы. Насустрач мне з-за пісьмовага стала выйшла жанчына. Не, не жанчына, а хутчэй, каралева. Строгі дзелавы касцюм васільковага колеру не хаваў, а падкрэсліваў прыгажосць фігуры і так пасаваў да рудых валасоў. У галаве закруціліся словы песні з матулінай кружэлкі:

Рыжая, рыжая,
Ты на свете всех милей.
Рыжая, рыжая,
Не своди с ума парней.

Цікава, чаму мужчыны так западаюць на рыжых? Мо таму, што спалучэнне рудых валасоў са скурай Снежнай Каралевы вельмі сексуальнае? Але хопіць разважаць, бо ў сваёй руцэ я адчуў цёплую далонь Насты і не ўтрымаўся, каб яе не пацалаваць. Я зірнуў у зялёную бездань вачэй і прамовіў:

— Вось так непрыкметна з юных прынцэс вырастаюць каралевы!

— Дзякуй за камплімент, Зміцер, але, мабыць, вы хацелі сказаць з брыдкіх лебядзяў, бо на прынцэсу вы, пэўна, звярнулі б увагу?

— Не, Наста. Я зразумеў, што толькі з узростам пачынаеш цаніць і разумець прыгажосць...

— Але мы не ў стане вярнуць тое, што згасла ўдалечыні... Таму толькі наперад!

— Згодны!

— Можа, кубачак кавы?

— Было б нядрэнна...

Мы селі на канапу, і сакратарка падала нам каву.

— Наста, скажу шчыра, ваша пасланне ўскалыхнула ўва мне нешта даўно забытае. Мы ўсё жыццё даказваем некаму, што на нешта здатныя, а ў рэшце рэшт хочацца даказаць самому сабе, што ты не нікчэмнасць, а чалавек. Вядома, у студэнцкія гады мы не былі анёламі, і алкаголь быў не лепшым сродкам выражэння ўнутранай свабоды, але другіх мы не ведалі... Сістэма нас абламала.

Але досыць філасофіі. Карацей, я сабраў хлопцаў. Мы гатовы рэпеціраваць. Толькі замест Валеры, калі вы не супраць, будзе іграць яго сын, бо Валеру забілі...

— Жах які! Я не ведала... Перадайце мае спачуванні яго жонцы і сыну. І, вядома, я не супраць, каб іграў сын Валеры. Зміцер, у мяне ёсць адрасы некаторых рэпетыцыйных залаў з узмацняльнай апаратурай і мікрафонамі. Праедзьцеся з сябрамі, паглядзіце і паведаміце мне, што вам спадабалася.

Я буду дамаўляцца аб умовах. І яшчэ: у мяне зараз пустуе дача на Мінскім моры. Пэўна, вашым сябрам патрэбна жытло — вось ключы. З усімі праблемамі звяртайцеся да мяне.

Мы развіталіся, але я адчуваў, што за звычайнымі словамі нашага дыялогу хаваўся нейкі пакуль што незразумелы мне патаемны сэнс...

Увечары мы з Алесем і Ігарам праехаліся па дадзеных Настай адрасах. Кропкі ў гаражах і маленькіх памяшканнях мы адмялі адразу — нам была патрэбна зала, па памерах падобная на канцэртную залу ўнівера. Нарэшце ў адным з дамоў культуры мы знайшлі добрае памяшканне з прыстойнай апаратурай.

— Сябры, — звярнуўся я да Алега і Ігара, — давайце параімся: у нас месяц часу. Колькі раз на тыдзень будзем збірацца?

— Ды хаця б разы тры, — уздыхнуў Ігар, — бо «давно не брал я в руки шашек».

— І па тры гадзіны, — дадаў Алесь.

— Што ж, тры — лічба сакральная, а калі яшчэ ў квадраце! Так і вырашым. Заўтра прыводзім у баявы стан свае музычныя інструменты, мяняем струны, успамінаем былы рэпертуар, а паслязаўтра першая рэпетыцыя!

Мы ўдакладнілі графік рэпетыцый з адказным за залу і вярнуліся ў маю аднапакаёўку.

— Сябры, сёння неяк перакантуемся ў мяне, а заўтра вы пераедзеце ў загарадны дом.

— Ты што, капіталіст, паспеў асабняк адгрохаць? — з'едліва спытаў Алесь.

— Вядома, з сухастоіны.

Вечарам мы елі смажаную бульбу, разглядвалі студэнцкія фотаздымкі, слухалі «Бітлоў» і ўспаміналі, успаміналі...

Пасля ранішняй кавы мы зайшлі ў «Гіпа», купілі халасцяцкі харчовы набор з ёгурту, пельменяў і кавы, і я накіраваў свой «Пежо» да кальцавой. Вось і дарога на Мядзель. Яшчэ трыста метраў — і паварот направа. Аднапалосная дарога шэрым вужом вілася між рыжавата-зялёных соснаў. Праязджаем мост, паварот налева, потым направа — і з-за дрэў лэд-зэпелінаўскім свінцовым дырыжаблем паказалася раззлаванае Мінскае

мора. Нябачны валадар вадаёма гнаў да берага паслухмяныя хвалі, якія на сваіх пеністых плячах неслі ўсё тое, чым «аддзячыў» яго чалавек за летні адпачынак. Камякі хімічнай пены, падобныя на мёртвых белых лебедзяў, гойдаліся на прыбярэжным трыснягу, пластыкавыя бутэлькі і пакеты вар'яцкім дываном высцілалі пляжны пясок, тысячы малькоў, плаваючы на спіне, глядзелі ў шэрае неба мёртвымі вачыма. Крыкі чаек, падобныя на галашэнне маці па забітым сыне, стваралі гукавое аздабленне гэтага палатна сюррэалізму эпохі канца свету.

— Сумна і лакрымозна, — прашаптаў Алесь.

— Проста нейкі сі бемоль мінор, — дадаў Ігар.

— У нас на Віцебшчыне такога яшчэ няма, — выказаўся Алесь.

— Будзе. Мы з вамі ў дзяцінстве маглі напіцца з ручая або рэчкі, а зараз? У Афрыцы людзі паміраюць ад смагі, а мы свае крынічныя багацці забруджваем з неабмежаванай хуткасцю. Ужо нават з артэзіянскіх свідравін піць ваду небяспечна. Праз два дзясяткі гадоў пітная вада будзе каштаваць даражэй за нафту, але на той час у нас яе ўжо можа не быць! — завёўся я.

— Ды я сёння сербануў вадзіцы з твайго крана. Ад хлоркі нават слёзы з вачэй паліліся! — сказаў Алесь.

— А без вады і не туды, і не сюды! — абазваўся Ігар.

— Вось і тэма для песні. Мальцы, здаецца, вунь там дачны пасёлак. Паехалі!

Паўсотні двухпавярховых катэджаў было пабудавана ў адным стылі і нядрэнна суадносілася з навакольным ландшафтам. Мы пад'ехалі да будкі ахоўніка і пастукалі ў дзверы. Адчыніў даволі жвавы мужчына.

— Настасся Пятроўна мне тэлефанавала. Праходзьце, калі ласка. Яе катэдж нумар 15 з левага боку.

— Дзякуй. А вада ў вас адключана?

— Чаму? Халодная ёсць, а яшчэ стаяць бойлеры, можна ўключыць ацяпленне, а можна і дровы ў каміне запаліць. Будзе цёпла! Дарэчы, нам патрабуецца ахоўнік. У вас няма надзейнага чалавека?

Я зірнуў на Ігара.

— Дык вось вам кандыдат. Некалі ў ахове служыў. А які ў вас графік?

— Суткі праз трое. Плацяць трыста баксаў. Ёсць тэлевізар, канапа. Ноччу можна паспаць, калі не дачны сезон. Так што, як будзе жаданне, давайце да нас!

— Дзякуй, мы падумаем.

— А што, Ігар? — запытаўся я, калі мы прайшлі на тэрыторыю. — Можа, ты за гэты час прыгледзішся, а потым падзяжурыш зімовы сезон, пакуль не знойдзем штосьці лепшае?

— Лепшае мне і не патрэбна. Я згодны.

Сказана гэта было абыякавым тонам. Тонам чалавека, які ад жыцця не чакае аніякіх змяненняў. Жыццё — гэта мары, старасць — успаміны, а абыякавасць і адсутнасць жаданняў — смерць. Патушылі, Ігарка, патушылі! Ці атрымаецца запаліць агмень у яго душы? Не ведаю…

А вось і катэдж Насты. Ацаліндраваныя бярвенні, шклопакеты, дах з чырвонага андуліну, дзесяць сотак зямлі, альпійская горка, басейн з німфеямі і ажурным мосцікам, маладыя яблынькі і грушы. Прыгожа, нават зараз.

— Прыстойны будынак! — канстатаваў Алесь.

— Гэта табе не якая-небудзь сухастоіна.

— І не кажы, браце…

На першым паверсе дома была зала з камінам і сталовая з невялікай кухняй, на другім — дзве спальні. Зручна і ўтульна. На журнальным століку я заўважыў два фотаздымкі ў прыгожых рамках. На адным была Наста, пэўна, з сынам, а на другім… наш гурт!

— Мальцы, зірніце на гэтае дзіва! Мо пазнаеце каго-небудзь?

— Дык гэта ж мы! — усклікнуў Алесь. — Што гэта быў за канцэрт?

— У інтэрнаце на Энгельса мы выступалі. На Восьмага сакавіка, — удакладніў Ігар.

— Правільна. Сябры, асвойвайце тэрыторыю! Вось вам па мабільніку. Дару! У памяці мой нумар. Калі што — тэлефануйце. Заўтра перад рэпетыцыяй я за вамі заеду. Бывайце!

Наступным вечарам мы сабраліся на першую рэпетыцыю. На сцэне былі ўзмацняльнікі, мікрафоны, ударная ўстаноўка. За дадатковую плату нам прынеслі сінтэзатар «Ямаха».

— Ці зможаце вы знайсці на некалькі рэпетыцый і канцэрт прыстойнага гукарэжысёра? — запытаўся я ў хлопца, які адказваў за апаратуру. — Яшчэ нам трэба будзе выставіць святло і зрабіць якія-небудзь візуальныя эфекты.

— Усё зробім, — усміхнуўся той, — і гукача знойдзем, і дым пусцім, і файер-шоў забамбім, як на салюце Перамогі. Нават аголеных дзяўчат можам паклікаць у падтанцоўку. Былі б грошы!

— Грошы будуць.

— Зміцер, — звярнуўся да мяне Ігар, — я на сінтэзатары не іграў. Мне б падабраць патрэбны тэмбр, або знайсці нашу старую іоніку.

— Наўрад ці мы адшукаем такі рарытэт. Ты ж ведаеш, што старыя інструменты спісвалі і разбівалі — быў такі дурацкі закон. Але дадзім запыт у інтэрнэт, а зараз іграй на шыкоўным сінтэзатары!

— Братан, а дзе твой знакаміты Fender Stratocaster? — запытаўся Алесь.

— Вось ён, радзімы.

Я расчахліў гітару, якую бацькі маёй сяброўкі некалі прывезлі з самой Кароны. На гэтую прыгажуню залатога 1958 года вырабу прыязджалі падзівіцца рокеры з усёй Беларусі і суседніх краін. Яе непаўторны «шкляны» гук быў ідэалам фэндэраўскага гучання. Пазней я для выразнасці гуку і тэмбравай разнастайнасці дадаў гібсанаўскі гукач хамбакер. Колькі прапаноў аб продажы я адхіліў! А колькі было спроб выкрасці маю прыгажуню!

— А ячуў, што Gibson лепей, чым Fender,— выказаўся Дзіма.

— Сынку, на Fender гралі і граюць Эрык Клэптан, Джэф Бэк, Марк Нопфлер, Рычы Блэкмар. А хто не ведае знакаміты Dlack Strat Дэвіда Гілмара? На магіле Джымі Хендрыкса, лепшага сола-гітарыста ўсіх часоў і народаў, які падчас сваіх каронных рыфаў атрымліваў аргазм, выгравіравана адлюстраванне гэтай гітары.

— Дарэчы, на онлайн-аўкцыёне зараз выстаўлены чорна-белы Stratocaster, які, нашыраўшыйся ў сіську Курт Кабэйн, разбіў падчас выканання свайго хіта «Smells like teen spirit». Старт — 50 штук баксаў. Гітара паддаецца аднаўленню. Я давёў

бы яе да толку. Можа, скінемся па рублю і набудзем? — выказаўся Алесь.

— Я буду збіраць пустыя бутэлькі на беразе Мінскага мора для першага ўзносу, — падаў ідэю Ігар.

— Сябры, мы трындзім, а час ідзе. Прапаную з наступнай рэпы...

— Якой такой рэпы? — запытаўся Алесь.

— Рэпетыцыі.

— Так і кажы! А то развёў тут агарод, мічурынец саматужны.

— Пагавары мне яшчэ, сухастойшчык! Камандаваць парадам буду я! Дык вось, з наступнай рэпетыцыі будзем збірацца на паўгадзіны раней, каб распецца. Падстроім інструменты. Ігар, дай мі другой актавы. Цяпер — сі. Соль. Рэ. Ля. Мі. Добра! Паіграем секвенцыі. Ігар — мі мажор! Пачынаем з ніжняй адкрытай струны. Пяць гукаў па паўтонах уверх і ўніз. Дзіма — тэмп lento.

— Не зразумеў.

— Павольна. Сёння дам табе метраном. Усе тэмпы да наступнага разу павінны быць у тваёй галаве!

— Сурова, хросны! Але буду старацца.

— Гатовы? Дзіма, тэмп! One, two, three, four! Больш рытмічна! Ігар, A-dur. Тое ж самае з другой струны. Паехалі!

Калі ўсе струны былі пройдзены, практыкаванне паўтарылі ў сярэднім тэмпе, а потым у хуткім.

— Сябра, — узмаліўся Алесь, — што ты нас ганяеш, як сяржант навабранцаў. У басухі ж лады ў два разы шырэй, чым на тваім Fender. Я ўжо ўзапрэў, а памперсы дома забыўся.

— Нічога. Паслухаў бы ты, як Муля ганяў сваіх «Песняроў»! Затое і вынік быў. Ты ў мяне праз пару рэпетыцый будзеш шаршатку пальцам у дошку заганяць!

— З цябе станецца...

— Успомнім інструменталкі. Рок-н-рольчык у мі мажоры. Тэмп andante. Go!

З горам напалам мы ўспомнілі рок-н-рол для пачаткоўцаў.

— Для падобнага выканання я прыдумаў новае слова: раздырбант! «Щитильней», як казаў Жванецкі, трэба, рабяты. Дзіма, тваім ударам не хапае моцы, рэзкасці і дакладнасці. На байцовым барабане ёсць маленькая па плошчы кружэлка,

якае дае аптымальную якасць гуку. Па ёй і трэба малаціць. Ты ведаеш, як рэпеціраваў Дзямешка?

— А хто такі Дзямешка?

— Эх, моладзь! Ды Дзямешка для Беларусі тое ж, што Рынга Стар для Брытаніі. Пясняр ён. Служыў, дарэчы, у Заслонаве. Дык вось ён прымацоўваў пяцікапеечную манету да сцяны або калодкі і малаціў па ёй палачкамі да тае пары, пакуль не расплюшчваў пятак у тонкі ліст. На апошняй стадыі ён рабіў гэта з заплюшчанымі вачыма.

— Я на апошняй стадыі не мог патрапіць шклянкай у рот нават з адкрытымі вачыма, — умяшаўся Алесь. — Праўда, не рэпетыцыі, а запою.

— Забудзем пра запоі. Пару пятакоў я табе знайду, Дзіма, дома папрактыкуешся. Добра. Зараз «Паліцэйскі ўчастак», потым «Малдаўскае віно».

Мы паігралі інструменталкі, потым песні, успомнілі тэксты і танальнасці. Тры гадзіны праляцелі непрыкметна. Пасля нас чакаў сваёй чаргі яшчэ адзін гурт. Калі рэпетыцыі робяцца для сябе, на іх нікога не трэба цягнуць пад прымусам. Гэта патрабаванне душы!

— Сябры, заўтра я запрашаю вас на канцэрт у філармонію. Спадзяюся, не забыліся, дзе яна знаходзіцца?

— Знойдзем!

— Хросны, а можна мне ўзяць з сабой дзяўчыну?

— Вядома, можна. Да сустрэчы!

Наступным вечарам я стаяў на прыступках ля ўвахода ў філармонію. Першымі паўночнымі матылямі ў паветры закружыліся сняжынкі. Яны за пяць хвілін модным берэтам упрыгожылі лысіну Якуба Коласа, пасерабрылі бараду дзеда Талаша і пафарбавалі ў белы колер жалейку Янкі-музыкі. З-за мірыядаў белакрылых эльфаў снежнай каралевай узнікла Тома, абвіла маю шыю рукамі і ў захапленні закрычала:

— Зміцер, гэта проста навагодні баль! Шыкоўна!

— Падаюць сняжынкі — дыяменты-росы,
Падаюць бялюткі за маім акном…
Расчасалі вішні шоўкавыя косы
І ўранілі долу снегавы вянок.

— Зміцер, ты чараўнік! Як ты здагадаўся, што гэтыя радкі Паўлюка Труса круціліся ў маёй галаве?

— Я не чараўнік, я толькі вучуся, але ведаю, што каханыя нават думаюць аднолькава.

— Дай я цябе пацалую, каханы аднадумец!

Тым часам падышлі Алесь з Ігарам, а потым і Дзіма з прывабнай дзяўчынай. Мы пазнаёміліся. Яе звалі Вольга.

— Пойдзем у філармонію, — прапанаваў я, — пакуль не ператварыліся ў снегавікоў. Сёння мы будзем слухаць «Паравіны года» Вівальдзі.

— Няўжо? Даўно марыў, - адазваўся Ігар. — «Паравіны года» Вівальдзі і Чайкоўскага самыя лепшыя.

— А мне і Вайцюшкевіч падабаецца, — заўважыў Дзіма.

— Гэта ўжо іншы жанр, але, бадай, яго лепшы дыск. Тут я з табою згодны.

Мы прайшлі ў памяшканне, распрануліся і падняліся ва ўтульную малую залу. Яна быццам бы спецыяльна была створана для гучання камернага аркестра, дзе валадараць некрыклівыя струнныя. Калі зрабіць параўнанне з жывапісам, то сімфанічны аркестр — гэта «З'яўленне Хрыста народу» Іванава, а камерны — «Гракі прыляцелі» Саўрасава. І яшчэ: калі першы аркестр — першамайская дэманстрацыя, то другі — падарожжа з каханай па восеньскім парку.

Загучалі першыя ўзнёслыя ноты, настройваючы душу на танальнасць яднання з прыгажосцю. Вясна. Сакавік. У сярэднявечнай Італіі, як калісьці і ў нас, новы год пачынаўся іменна з вясны. І гэта правільна, бо абуджэнне прыроды павінна быць пачаткам усяго новага, у тым ліку і года. Іграў моладзевы калектыў. І калі ім дзесьці не хапала майстэрства, то пачуцця было праз край, а гэта ў музыцы галоўнае. Звязаныя срэбным ланцугом агульнага рэфрэну луналі месяцы. Вось і мой любімы жнівень. Трывожныя водгаласы скрыпак і каноннае рэха альтоў абвясцілі набліжэнне навальніцы. Барадаты Пярун пракаціўся па небе на сваёй залатой калясніцы і шпурнуў на зямлю зграю карных маланак. «Хавайцеся, людзі! Бяда!»

Краем вока я зірнуў на Ігара. Па яго шчаках каціліся слёзы. І ён не саромеўся іх. Яны былі ачышчэннем. Толькі музыка па-

добнага ўзроўню здатна гаіць нябачную субстанцыю, пасечаную здрадамі, крыўдамі і болем, якая завецца душой.

А музыка гучала. Музыка гучала.

Музыка гучала.

Музыка гучала.

Музыка гучала.

Музыка гучала.

Музыка

гуча-

ла.

— Можа, пойдзем у кафэшку, пап'ём кавы? — прапанаваў я пасля канцэрта.

— Ды не, Зміцер, — адмовіўся Алесь. — Музыка Вівальдзі патрабуе яднання з прыродай. Таму мы з Ігарком даедзем на электрычцы да Мінскага мора, пройдземся пешшу праз зімовы лес, запалім дровы ў каміне, будзем піць зялёную гарбату з кветкамі язміну, глядзець на полымя і марыць...

— А мы спяшаемся на электрычку, — сказаў Дзіма.

— Ну, тады да заўтрашняй рэпетыцыі!

— Бывайце.

Мы з Томай пагулялі па парку Горкага, прыехалі да мяне, і калі б Снежная Каралева мела тэмперамент маёй каханай, то ў Арктыцы даўно б квітнелі яблыні...

На адну з наступных рэпетыцый прыехаў Лёва. Ён спяваў у нас верхні голас, таму на гэты раз больш працавалі над вакалам.

— Мужыкі, — узяў слова Дзіма, — вы падчас выканання стаіце, нібы муміі, а трэба каўбасіцца.

— Гэта як?

— Весці сябе актыўна і энергічна. Танцаваць, торгацца.

— Хлопча, — выказаўся Алесь, — мы пачыналі каўбасіцца пасля другой бутэлькі «чарніла», а зараз ужо не той узрост...

— Правільна, — пагадзіўся я, — мы ж не фанершчыкі якія-небудзь, і калі падчас спеваў будзем танцаваць, то замест

прыгожых акордаў атрымаецца поўны трындзец. Таму дамовімся: ты будзеш каўбасіцца за ўсіх.

— Ды ўжо пастараюся! Дарэчы, якая ў нас будзе канцэртная вопратка? Можа, будзем выступаць з аголенымі торсамі?

— Братка ты мой, калі студэнткі ўбачаць Лёўкіна пуза ў спалучэнні з лысінай, то ім ужо будзе не да музыкі! Яны парвуць яго на запчасткі, — выдаў Алесь. — Ды і мы ўжо далёка не Шварцнэгеры…

— Табе мой мамон не даспадобы? — пакрыўдзіўся Лёўка. — На яго жанчыны ліпнуць як мухі на мёд. Не ўсім жа падабаюцца жалезныя камякі мускулаў, многім хочацца прыціснуцца да чаго-небудзь мяккага, а выступаць я прапаную ў чорных касцюмах пры гальштуках, як раннія «Бітлы». Усё ж такі афіцыйнае мерапрыемства.

— Не, не трэба аніякага афіцыёзу, — умяшаўся я, — прапаную блакітныя джынсы і светлыя майкі з кароткім рукавом, на якіх мой знаёмы зробіць лагатып нашага гурта. Лады?

— Лады!

# Канцэрт



Мы рыхтаваліся да канцэрта ў невялікім памяшканні за сцэнай. Раптам у дзверы пастукалі, і ў пакой увайшла Наста. Яна была падобна на мадэль з французскага часопіса, якая рэкламуе адзенне для лэдзі сярэдняга ўзросту.

— Прывітанне, хлопцы! Як настрой?

— Прывітанне. Настрой баявы!

— Цудоўна! Зміцер, можна вас на хвіліну?

Мы выйшлі на калідор. Наста дастала з сумачкі пакунак і перадала мне: «Вось абяцаны ганарар. Зміцер, я спадзяюся, што пасля канцэрта наша знаёмства не перарвецца. Мне так многа хочацца вам сказаць...» Раптам Наста зрабіла адчайны крок наперад, абняла мяне, моцна пацалавала і імкліва выбегла ў залу. Маё сэрца ўзбуджана закалацілася. Вось гэта паварот сюжэта! Спрацаваў мабільнік і тым самым вярнуў мяне ў рэальнасць. SMS-ка ад Томы: «Каханы, я атрымала вынікі аналізу. У нас будзе дзіця!» Хваля пяшчоты прабегла па маім целе. Вось выбар і зроблены. Кожны чалавек марыць прадоўжыць сваё нядоўгае існаванне на нашай гаротнай і цудоўнай планеце Зямля. Робіцца гэта з дапамогай шэдэўраў прозы, паэзіі, жывапісу, музыкі і гэтак далей. Але дзіця — самы просты і надзейны варыянт неўміручасці. Пэўна, і паміраць не так сумна, калі ведаеш, што твой адбітак працягвае існаванне.

Я вярнуўся да хлопцаў.

— Сябры, пасля канцэрта я аддам вам ганарар, але за гэты час прашу прыняць рашэнне. Вы ведаеце, што Дзіму хутка патрэбна вяртаць доўг за Валеру. Я аддаю яму сваю частку ганарару.

— Я таксама, — падтрымаў Ігар.

— На егіпецкую жонку гэтых грошай усё роўна не хопіць, таму я, безумоўна, далучаюся, — выказаўся Алесь. — Лёва, тваё слова.

Было бачна, што ў сэрцы Лёвы скнапнасць Гарпагона змагаецца з рэшткамі высакародных пачуццяў. І яны перамаглі. «Я з вамі», — сціпла сказаў ён.

Я зірнуў на Дзіму. На вачах хлопца блішчэлі слёзы. Ён падбег да кожнага з нам, абняў і дрыжачым ад хвалявання голасам вымавіў:

— Я не ўмею прыгожа гаварыць, але ведайце, што ў кожнага з вас цяпер ёсць сын, гатовы аддаць за вас жыццё!

— А што, хлопцы, — выказаўся Алесь, — можа, мы гэтых рэкеціраў паставім на вушы? У лепельскім шалмане мы нядрэнна махаліся, а жыццё без прыгод — проста балота.

— Падумаем, братан, а цяпер на сцэну!

Вядучы абвясціў:

— А зараз вы ўбачыце і пачуеце легендарны ўніверсітэцкі гурт «Мішка касалапы», які прыехаў павіншаваць сваю alma mater з юбілеем. Спонсарам хлопцаў з'яўляецца наша былая выпускніца, а зараз паспяховы бізнесмен — Настасся Пятроўна. Вітаем!

Пачуліся воплескі, заслона рапалавінілася і плаўна паехала ў розныя бакі. Я зірнуў на хлопцаў. Алесь з пасівелымі і перахопленымі чырвона-белай стужкай пасмамі доўгіх валасоў трымаў свой самаробны Rickenbacker, які збярог нават падчас шалёных запояў, як Рэмба кулямёт перад атакай в'етконгаўцаў. Ігар са збялелым ад хвалявання тварам нервова перабіраў клавішы іонікі. Лёва, чыя лысіна александрыйскім маяком свяцілася пад промнямі сафітаў, збянтэжана ўсміхаўся і насоўкай праціраў грыф рытмухі. Дзіма, седзячы за нашай шматпакутнай Амаці з малюнкам мядзведзя з гітарай на бас-барабане, круціў

між пальцаў барабанную палачку. Усе былі на трэцяй — апошняй — стадыі перадканцэртнага хвалявання. Цудоўна!

Я падміргнуў Дзіму: «Давай, сынку!» Молатам Тора забухала «бочка», а між пальцаў узнятых рук перкусініста прапелерамі закруціліся барабанныя палачкі. Пад зачараваныя позіркі гледачоў яны галубамі ўзляцелі ўверх і праз некалькі імгненняў, якія мне здаліся вечнасцю, паслухмяна вярнуліся ў рукі гаспадара. Збіўка. Прабіўны звон хай-хэта. Срэбнае рэха талерак. Піянерскі водгук малога барабана. Тра-та-тад-тад! Тра-та-тад-тад! Панеслася душа ў рай! Малайчына, Дзімка! Валера б ганарыўся такім сынам. Вось і першыя апладысменты. Я перавёў позірк направа: «Пара, Алесь, твая чарга!» Сябра зрабіў павольнае глісанда знізу ўверх на чацвёртай струне, якое ён называў «сярпом па яйцах», а потым пазногцем, узбуджаючы нервы слухачоў да стадыі шаленства, паўтарыў той жа прыём у адваротным накірунку. Гэта ў Алеся называлася «цаглінай па шкле». І вось ужо наша рытмічная секцыя адладжана пульсуе. Лёва мі мажорам далучыўся да агульнага рытму, які міжволі гіпнатызаваў слухачоў, і яны пакрысе пачалі разгойдвацца ў зададзеным тэмпе. Іоніка Ігара сваім непаўторным вібруючым гучаннем вярнула нас на дваццаць гадоў назад. Што ж, пара і мне. Педаль у падлогу і панеслася! Пройдземся фузам па барабанных перапонках! Цяпер, калі слухачы звязаныя з намі нябачнымі ланцугамі рытму, пара і голас падаць. Я кіўнуў адказнаму за спецэфекты, і чатыры слупы вогненных светлякоў узляцелі пад столь. І з-за гэтай вогненнай стыхіі ў высокім рэгістры ва ўнісон загучалі нашы надрыўныя галасы:

— Мішка касалапы,
По лесе ён ідзе,
Шышкі там збірае,
Песеньку пяе.

На дадаісцкім прыпеве, геніяльная бессэнсоўнасць якога была вяртаннем у перыяд лепету немаўляці або эпоху навучан-

ня пячорнага чалавека першым гукам, мы раздзяліліся на тры галасы і дадалі ў гучанне джококераўскай хрыпаты:

— А-хулі-пулі,
А-хулі-пулі.
Хулі-пулі, хулі-пулі,
Хулі-пулі!

А вось і наш знакаміты роў пяцярых узбуджаных да стадыі ахуення ласёў у перыяд гону:

— Р-р-р-а-а-а-а-ў!!!

Выкладчыкі і старэнькія прафесары пад уздзеяннем выбуху гукавой віягры падскочылі ў сваіх крэслах, а былы старшыня камітэта камсамола па старой звычцы памахаў нам пальцам: «Не фулюганьце!» Алесь паказаў яму выцягнуты сярэдні палец — жэст, значэнне якога зараз ведаюць нават першакласнікі.

А мы працягвалі. Адгучаў другі куплет з прыпевам, уключаем прымочку, і мой верны Fender Stratocaster рыфавым могулам па купінах і пагорках панёс сэрцы слухачоў з вяршыні Джамалунгмы ў бяздонную прорву. Леднікі, скалы, цясніны, паветраныя ямы, дзе перахоплівае дыханне і сэрца падскоквае да самага горла, рызыка імгненнай смерці і кайф палёту без крылаў п'яным качагарам кідалі ў кроў шуфлі адрэналіну. Дасягнуўшы райскай даліны, я наступіў на хвост макакі, якая задрамала, і яе раз'юшаны віскат страсянуў арэх з какосавай пальмы прама ў рукі ёга падчас медытацыі, які зірнуў у бок Гімалаяў і ўзнёс хвалу за падарунак Крышне:

Харэ, Крышна, Харэ!
Харэ, Харэ,
Харэ, Харэ!
А каму яшчэ па хары?!

На імгненне затрымаемся на каменным плато, дзе на плоскім валуне поўзаюць чырвоненькія казуркі.

— Прывітанне, дон Хуан! Прывітанне, дон Хенаро!

Прамаўчалі знакамітыя магі — яны прайшлі праз шчыліну паміж сусветамі і існавалі ўжо ў іншым вымярэнні.

Цяпер на трыёлях, якія вібрыруюць, панясёмся па бурунах і вадаспадах горнай рэчкі да велічнага акіяна. Уніз! Уверх! Трах! Цібідох! Фы-р-р-р! Бу-у-у-ль! Пырскі! Пена! І нарэшце праз хаос першастыхій велічным утаймавальнікам загучаў сітар Індыйскага акіяна. Coda!

Шквал авацый вярнуў мяне ў рэалію. Алесь непрыкметна паказаў мне вялікі палец: «Саляк быў класны!» Канешне, не Эрык Клэптан, але яшчэ нешта магу. Наста ўскочыла з крэсла і ў захапленні пляскала ў далоні. Мы з хлопцамі перакінуліся задаволенымі позіркамі. Мы змаглі! Дзеля падобных хвілін і варта жыць!

Я падышоў да мікрафона: «Дзякуй! Мы віншуем усіх прысутных з юбілеем нашай alma mater. Жадаем моладзі, каб тыя веды, якія яны атрымаюць, суадносіліся з дастойным заробкам. І помніце: усё мінае, а музыка застаецца, бо яна — першы крок да свабоды. Шчасця вам!»

І раптам з дынамікаў загучаў хрыплаваты голас Алеся: «А нашаму былому старшыні камітэта камсамола, цяпер прафесару і сааўтару, падкрэсліваю, — сааўтару, дзясяткаў навуковых прац Аляксандру Васільевічу Цмоляку наша музычнае... » І мы ў тэрцыю ўрэзалі: до-рэ-мі-до-рэ-до.

Што тут адбылося! Твар Цмоліка пабіла барвовымі плямамі — ён ведаў музычную ненарматыўную лексіку. Ведалі яе і студэнты. Пачуўся аглушальны свіст, тупат ног і крыкі: «Ганьба! Ганьба! Ганьба!» Бачна, гэты дзеяч ідэялагічнага фронту сваімі падлянкамі быў вядомы не аднаму пакаленню студэнтаў. Дзіма нечаканым дырыжорам ударамі кардана прывёў у адладжаны рытм стыхійную гукавую какафонію. Алесь дадаў рыканне басухі, а Ігар смеху іонікі. Мы з Лёўкам дапамаглі гітарамі. Музычна-гукавы мітынг быў прысвечаны знішчэнню подласці і здрады. Раз'юшаны Цмоляк і некалькі яго падхалімаў пад разбойны посвіст гледачоў выскачылі з залы.

— Сябры, а цяпер, калі паветра ў зале стала чысцей, мы іграем для вас!

Ласкава і пяшчотна з блюзавымі падцягамі і адхіленнямі загучала мая гітара. Самотнымі ўсхліпамі, у якія была ўкладзена ўся роспач скалечанага жыцця, заплакала іоніка Ігара. Мяккае басовае люлянне Алеся дадало надзеі ў маркоту існавання.

Блюз — гэта калі добраму чалавеку дрэнна. А дрэнныя блюз не разумеюць. Я заплюшчыў вочы і заспяваў:

— Вось і верас ужо зацвіў, мая каханая.
Фіялетавым агнём палае дол.
Вараць пікты па начах пітво духмянае –
Цёмны мёд, і накрываюць стол.

Кароткі пройгрыш, і Лёўка сваім мяккім тэнарам заспяваў у тэрцыю са мной:

— Мы запрошаны з табой, мая каханая.
Там чакае Конайр, наш кароль.
У рабінавую ноч, у цемру п'яную
Сыдзем. Шлях пакажа геральд-троль.

Яшчэ пройгрыш, і Алесь заспяваў ва ўнісон з намі, толькі на актаву ніжэй:

— Мы не вернемся назад, мая каханая.
Да былога спалены масты.
На шляху да берага жаданага
Будуць воля, верас, я і ты.

Перад маімі вачыма раскінулася бясконцая верасовая пустка, па якой з надзейным мячом у заплечных ножнах крочыў я ў вобліку Конана-варвара. Побач бяжыць прыручаная балотная рысь, а ў бяздонным небе лунае верны сокал. На мяне ласкава пазірае дзяўчына, апранутая ў ваўчыныя скуры, з лукам за спінай. Мы крочым да бурлівага мора, дзе нас чакае карабель з суровымі вікінгамі, каб рушыць да невядомых краін насустрач прыгодам.

Я не ведаю, што нас чакае заўтра. Алесь можа сарвацца ў шалёны запой, Ігар трапіць у Навінкі або тугую пятлю, Лёўка зваліць у Ізраіль, а Дзіма — загінуць у сутычцы з бандытамі. Але гэта будзе заўтра. А сёння мы адзінае цэлае, якое завецца гуртам «Мішка касалапы». І мы граем рок.

*2010-2012 гг. Вёска Дварэц*

# Змест

Падарожжа першае. Валера .......................................... 17
Падарожжа другое. Алесь .......................................... 23
Падарожжа трэцяе. Ігар .......................................... 53
Падарожжа чацвёртае. Лёва .......................................... 69
Падрыхтоўка да канцэрта .......................................... 83
Канцэрт .......................................... 95



*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Вашчанка** Аляксандр Пятровіч

ROCK FOREVER,
АЛЬБО ЧАТЫРЫ ПАДАРОЖЖЫ Ў МІНУЛАЕ

Рэдактар *А. П. Вашчанка*
Мастацкі рэдактар *А. П. Вашчанка*
Тэхнічны рэдактар *А. П. Вашчанка*

12+

Падпісана да друку 20.03.2023. Фармат 60х84/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 5,86. Улік.-выд. арк. 3,82.
Тыраж 25 экз. Заказ 49.

ТАА «Белпринт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/97 ад 02.12.2013, № 3/699 ад 22.08.2014.
Вул. Л. Бяды, 45, 220113, г. Мінск.

ТАА «Бізнесафсет».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/28 ад 12.12.2013.
Пр. Незалежнасці, 95/16-61, 220012, г. Мінск.



ISBN 978-985-459-625-9

Аляксандр Вашчанка

Rock forever, альбо Чатыры падарожжы ў мінулае